ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 64 (2117)
9 жніўня 1966 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

НАШ КУРС—ЛЕНІНСКІ, НАШ КРОК—ЦВЁРДЫ

Па нашай зямлі крочыць жнівень — месяц маладога хлеба, духмянага мёду, крамяных яблык, месяц маладога віна, ласкавага сонца і аксамітавых зорападных начэй. Месяц радаснага настрою і светлых надзей...

Сёлета пачатак руплівага і багатага на шчодрыя дары жніўня супаў са знамянальнай і важнай падзеяй — у Маскве працавала першая сесія Вярхоўнага Савета СССР сёмага склікання. За яе работай з вялікай цікавасцю сачылі ўсе савецкія людзі і шырокая міжнародная грамадскасць.

Два дні работы сесіі прадэманстравалі непарыўную сувязь і адзінства партыі і народа — аснову моцы і велічы нашай Радзімы. Народныя выбраннікі вырашалі важнейшыя дзяржаўныя задачы — надзённыя задачы камуністычнага будаўніцтва і міжнароднага становішча. Яны выбралі Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР, зацвердзілі састаў урада — Савета Міністраў СССР, прынялі пастановы аб утварэнні пастаянных камісій палат— Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей і выбралі саставы гэтых камісій, зацвердзілі Указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, адобрылі Заяву ўрада СССР аб асноўных пытаннях унутранай і знешняй палітыкі, прынялі Зяяву Вярхоўнага Савета СССР у сувязі з узмацненнем агрэсіі амерыканскага імперыялізму ў В'етнаме.

Якія галоўныя вынікі сесіі савецкага парламента?

У галіне ўнутранай палітыкі намаганні партыі і ўрада накіроўваюцца на ажыццяўленне планаў новай пяцігодкі, якая пачала ўжо свой імклівы разгон. Нам трэба будзе вырашыць вялікі і складаны комплекс гаспадарчых, сацыяльных і палітычных задач. Для гэтага ў нас ёсць надзейны компас — рашэнні, выпрацаваныя на кастрычніцкім (1964 г.) і наступных Пленумах ЦК КПСС, на XXIII з'ездзе партыі, — рашэнні, якія вызначылі новы падыход да выканання задач камуністычнага будаўніцтва. Кіруючыся гэтым компасам, партыя і ўрад будуць няўхільна ўдасканальваць кіраўніцтва народнай гаспадаркай краіны, дабівацца паскарэння тэмпаў развіцця асноўных галін прамысловасці і сельскай гаспадаркі, клапаціцца аб найбольш поўным задавальненні матэрыяльных запатрабаванняў савецкіх людзей, развіваць нашу сацыялістычную дэмакратыю.

Вялікая ўвага будзе ўдзяляцца духоўнаму росту савецкага чалавека. У новай пяцігодцы вылучаюцца сродкі для ўмацавання вучэбна-матэрыяльнай базы школы, расшыраецца прыём у прафесіянальна-тэхнічныя вучылішчы, далейшае развіццё атрымае вышэйшая і сярэдняя спецыяльная адукацыя. У пяцігадовым плане будзе прадугледжвацца далейшае будаўніцтва тэатраў, кіно, бібліятэк, клубаў, асабліва ў сельскай мясцовасці.

У галіне знешняй палітыкі галоўны клопат нашай партыі і ўрада будзе заключацца па-ранейшаму ў тым, каб разам з іншымі сацыялістычнымі дзяржавамі забяспечыць спрыяльныя міжнародныя ўмовы для будаўніцтва сацыялізма і камунізма. Курс савецкай знешняй палітыкі — гэта курс на ўмацаванне адзінства і згуртаванасці сацыялістычных краін, іх дружбы і брацтва, на падтрымку народаў, якія змагаюцца за сваё нацыянальнае вызваленне, на ўсебаковае супрацоўніцтва з маладымі незалежнымі дзяржавамі, на сцвярджэнне прынцыпаў мірнага суіснавання краін з розным сацыяльным і палітычным ладам, на аказанне рашучага адпору агрэсіўным сілам імперыялізму, на папярэджанне новай сусветнай вайны.

Усе савецкія людзі горача адабраюць і падтрымліваюць рашэнні сесіі Вярхоўнага Савета СССР, курс нашага ўрада па асноўных пытаннях унутранай і знешняй палітыкі.

Вынікі сесіі радуюць і работнікаў савецкай літаратуры і мастацтва. Радуюць і абавязваюць. У працоўных буднях савецкіх людзей, у іх велічных здзяйсненнях чэрпаюць пісьменнікі і мастакі сваё творчае натхненне, знаходзяць тэмы і герояў...

У нас — добры настрой. Мы будуем камунізм. Мы ўпэўнена глядзім у сваю будучыню. Мы ведаем, што сілы нашы магутныя, што справа наша непераможная.

Курс наш — ленінскі. І таму крок наш — цвёрды.

Педагогі і вучні Цімкавіцкай сярэдняй школы імя Кузьмы Чорнага Капыльскага раёна рыхтуюцца шырока адзначыць 50-годдзе Савецкай улады. Яны збіраюць дакументы аб станаўленні Савецкай улады ў сяле Цімкавічы, аб героях-земляках, якія змагаліся з фашыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У школе абсталёўваюцца стэнды, на якіх будуць экспанавацца найбольш цікавыя дакументы, фотаздымкі, успаміны арганізатараў і абаронцаў Савецкай улады ў сяле. Спецыяльны стэнд раскажа пра тое, што дала Савецкая ўлада мясцовым жыхарам, пра людзей, якіх школа вывела на шырокую дарогу жыцця.

На здымку, які зрабіў фотакарэспандэнт БЕЛТА П. Наватараў, дырэктар Цімкавіцкай сярэдняй школы заслужаная настаўніца Беларускай ССР Зінаіда Іосіфаўна Раманенка разам з дзевяцікласнікамі Святланай Татур, Елізаветай Зеліковіч і Нінай Лебедзь чытаюць пісьмы, атрыманыя ад герояў-землякоў.

ЭСТАФЕТА ІДЗЕ ПА РАЁНУ

Амаль у кожнай вёсцы нашага раёна можна знайсці краязнаўцаў-аматараў. Яны збіраюць цікавыя звесткі пра баявыя і працоўныя подзвігі сваіх землякоў. Гэтыя матэрыялы знаходзяць сабе месца ў краязнаўчых кутках і музеях, на выстаўках і стэндах, прысвечаных слаўнаму мінуламу родных мясцін, іх смелым і працавітым людзям.

Вось назвы некаторых тэматычных альбомаў-летапісаў: «Вечная слава героям», «Іх імёны бессмяротныя», «Нашы землякі — выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі Савецкай Арміі», «Ветэраны калгаснай працы» і інш.

Цяпер у раёне праходзіць эстафета пад дэвізам: «Не забудзем мы — не забудуць нашчадкі». У эстафеце ўдзельнічаюць усе ўстановы культуры. Яны пішуць гісторыю калгасаў і саўгасаў.

Адкрываецца шмат малавядомых фактаў, звязаных са станаўленнем Савецкай улады ў раёне.

Напрыклад, актывісты бібліятэкі і Дома культуры ў гарадскім пасёлку Ула даведаліся, што першым старшынёй мясцовага валаснога рэўкома быў Аляксандр Аляксандравіч Нядзведскі, удзельнік рэвалюцыі 1905—1907 гадоў. Стала вядома і тое, што першае пасяджэнне валаснога рэўкома адбылося 27 красавіка 1920 года. Тады ж была створана мясцовая партыйная ячэйка бальшавікоў. На пасяджэнні рэўкома абмяркоўвалася і пытанне аб падрыхтоўцы да святкавання 1 Мая. Было вырашана на плошчы пасёлка ў дзень свята пасадзіць парк і назваць яго «Першамайскім», а таксама аказаць матэрыяльную дапамогу сем'ям чырвонаармейцаў.

Краязнаўцы даведаліся, што першая камсамольская арганізацыя ў гарадскім пасёлку пачала сваю дзейнасць у 1921 годзе. Яе сакратаром быў Іван Фёдаравіч Каранеўскі. У гады Вялікай Айчыннай вайны ён быў камісарам партызанскай брыгады, што дзейнічала ў Бешанковіцкім раёне.

Новыя матэрыялы дапамагаюць работнікам культуры больш цікава праводзіць вечары сустрэч з першымі арганізатарамі калгасаў, з першымі піянерамі, камсамольцамі, стаханаўцамі.

Нядаўна перад чытачамі Бортнікаўскай сельскай бібліятэкі выступіў былы арганізатар мясцовага камітэта беднаты Барыс Фаміч Гамзюк.

Першы этап эстафеты закончыўся. Ён даў многа новых дакументаў пра рэвалюцыйнае мінулае раёна, пра падзеі, якія тут адбываліся ў гады даваенных пяцігодак.

Цяпер актывісты клубаў і бібліятэк збіраюць звесткі пра подзвігі сваіх землякоў у дні Вялікай Айчыннай вайны. Трэці этап эстафеты будзе прысвечаны пошукам людзей працоўных подзвігаў, героям сённяшніх дзён.

Ул. БЕРДНІК,
інспектар Бешанковіцкага раённага аддзела культуры.

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

ВЫПУСКАЕ ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

— Якія новыя музычныя творы неўзабаве выйдуць з друку?

З такім пытаннем карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» звярнуўся да старшага рэдактара музычнай рэдакцыі выдавецтва І. Кузняцова. Вось што ён паведаміў:

— Мы выпускаем кнігу С. Грабеншчыкава «Сцэнічныя беларускія танцы». Гэта апісанне многіх папулярных, а таксама малавядомых беларускіх танцаў. Зборнік «Эстрадныя песні» пазнаёміць аматараў музыкі з сольнымі песнямі беларускіх кампазітараў. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці, мяркую, зацікавяцца нашымі новымі кнігамі «П'есы для народных аркестраў» і «Песні для хору з баянам». Рыхтуецца да друку і шэраг іншых музычных твораў.

СУСТРЭЧА З КАМПАЗІТАРАМ

У Ваўкавыскім раённым Доме культуры адбылася сустрэча працоўных горада з кампазітарам Уладзімірам Алоўнікавым. Перад пачаткам канцэрта, у якім прымаў удзел Дзяржаўны народны аркестр БССР і салісты філармоніі, кампазітар расказаў пра свае планы, пра тое, як мацнеюць сувязі кампазітараў Беларусі з кампазітарамі братніх рэспублік, падзяліўся ўражаннямі аб сустрэчах на Фестывалі беларускага мастацтва ў Расійскай Федэрацыі.

У канцэрце выконваліся часткі сюіты Ул. Алоўнікава «На Палессі», а таксама яго песні.

НАРОДНЫ ТЭАТР СТАВІЦЬ АПЕРЭТУ

Рэдка які з народных тэатраў адважваецца ставіць музычныя творы, скажам, аперэту. А вось кіраўнікі Ашмянскага народнага тэатра вырашылі, што гэта ім пад сілу. Для прэм'еры яны абралі аперэту Ю. Семяныкі «Рабінавыя каралі». Ставіць яе рэжысёр І. Сідней, афармляе мастак Ул. Жыгалаў.

Самадзейным артыстам дапамагае аўтар аперэты.

НА СЦЭНЕ—НОВАЯ СЮІТА

Народны ансамбль песні і танца Гомельскага Палаца культуры чыгуначнікаў імя Ул. І. Леніна старанна рыхтуецца да 50-годдзя Савецкай улады. Цяпер калектыў падрыхтаваў да пастаноўкі новую вакальна-харэаграфічную сюіту. Песнямі і танцамі самадзейныя артысты расказваюць аб велічных здзяйсненнях нашай рэспублікі за гады Савецкай улады.

У АНСАМБЛІ «ДРУЖБА» — НАШ ЗЯМЛЯК

Савецкі вакальны ансамбль «Дружба» заваяваў шырокае прызнанне гледачоў за дзесяць гадоў творчай дзейнасці. Дастаткова ўспомніць, што яшчэ ў 1957 годзе ён стаў лаўрэатам Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве, а ў 1962 годзе заняў першае месца на Усерасійскім конкурсе артыстаў эстрады.

Назва ансамбля «Дружба» сапраўды сімвалічная, бо ў ім сабраліся артысты розных нацыянальнасцей — рускія, украінцы, эстонцы... Спявае ў гэтым творчым калектыве і наш зямляк—Мікалай Дзідзенка.

МАГІЛЁЎСКІЯ КНІЖНЫЯ МАНБЛАНЫ



Ёсць казка, у якой лялькі штоночы ажываюць і расказваюць пра нягоды, крыўды і пакуты свайго жыцця, пратэстуючы супраць жорсткасці і неахайнасці сваіх юных гаспадароў.

Яе, відаць, ведаюць магілёўскія работнікі кніжнага гандлю.

Ды што ім гэтая наіўная казка перад той, якую яны самі стварылі!

Паглядзі, чытач, на здымак.

Гэта — кніжны склад № 5 Магілёўскага абкнігагандлю. Такі ж здымак можна было зрабіць і на складзе № 3, што ў будынку былой царквы, дзе гуляе вецер з дажджом і снегам ды знаходзяць сабе прытулак галубы.

Ажылі б гэтыя кнігі — і яны спапялілі б абурэннем і гневам усіх, хто асудзіў іх на такое гібенне.

Горы кніг... Пакункі згрувашчаны адзін на адзін. Гнілыя, пакаржаныя з заплеснелымі вокладкамі, на іншых нават цяжка прачытаць назву.

Шчыра кажучы, я ніколі не думала, што ў наш час можна яшчэ ўбачыць такое.

А між тым у Магілёўскім абкнігагандлі панує спакойны настрой. Гісторыя цягнецца ўжо некалькі гадоў, і з ёю звыкліся. Адно, што там робяць, гэта «оптам і ў розніцу» спісваюць кнігі ў макулатуру альбо ўцэньваюць іх.

У канцы 1964 года было спісана і ўцэнена кніг, якія страцілі свой таварны выгляд, на кругленькую суму — 300 тысяч рублёў, летась — на 43,5 тыс. руб., а сёлета за шэсць месяцаў — на 62 тысячы рублёў.

Ідуць у макулатуру або ўцэньваюцца творы Гогаля, Лермантава, Някрасава, Тургенева, Талстога, Чэхава, Купрына, Буніна, Бернарда Шоу, Дзікенса, Гюго, Мапасана, Бальзака, Горкага, Маякоўскага, Гайдара, Твардоўскага, Коласа, Купалы, Чорнага, Маўра, Куляшова, Глебкі, Брыля — пералік можна прадаўжаць і прадаўжаць. А колькі актуальнай палітычнай літаратуры, якая не страціла свайго значэння і сёння, каштоўных выданняў па пытаннях сельскай гаспадаркі, навукі, тэхнікі, будаўніцтва, кніг з серыі «Жыццё выдатных людзей»...

Вядома, на складах асела не толькі гэтая літаратура. Заляжалася тут вялікая колькасць брашур-аднадзёнак, напісаных да розных юбілеяў і кампаній. Гэтую «брашурню», як гавораць работнікі складаў, трэба неадкладна спісваць, каб не замінала ў рабоце, не займала месца.

Зрэшты, паспрабуйце ў такім вэрхале, які я ўбачыла на складах, знайсці патрэбную кнігу. Для гэтага трэба перакапаць гару, ды і то наўрад ці знойдзеш — бо невядома, дзе што ляжыць.

Час ужо навесці хаця б элементарны парадак на складах, каб адабраць, выратаваць ад псавання літаратуру, якую яшчэ можна сёння прадаваць.

Трэці месяц на складах працуюць дзве камісіі па спісанню і ўцэнцы літаратуры мінулых год выдання. Работа гэта марудная, трэба перагледзець кожную кніжку і брашуру. Людзей жа, якія разбіралі б кніжныя залежы, не хапае, і справа безнадзейна зацягваецца. Набліжаецца восень, а за ёю зіма. У халоднай царкве тады не ўседзіш, бо нават цяпер, летам, тут людзям даводзіцца працаваць у валёнках.

А чаму б, скажам, дырэктару абкнігагандлю таў. Белісаву не звярнуцца ў абласное ўпраўленне культуры, у аддзел народнай асветы, каб яны прыслалі бібліятэкараў. Нагадаем, што камісіям дадзена права бясплатна перадаваць у бібліятэкі спісаную літаратуру, і гэта можна было б выкарыстаць для ўзаемнай карысці. Сярод спісаных кніг ёсць многа твораў, якія вывучаюцца ў школах, якія можна паспяхова скарыстаць для пазакласнага чытання. Крыху падрамантаваўшы, іх можна ставіць на паліцы сельскіх і школьных бібліятэк.

Думаю, што каб дырэктар абкнігагандлю быў больш настойлівы, ён не адзін раз зайшоў бы ў абласны камітэт партыі, аблвыканком, і яму абавязкова дапамаглі б.

Будзем спадзявацца, што Дзяржаўны камітэт па друку пры Савеце Міністраў БССР прыме неадкладныя меры, каб у бліжэйшы час ліквідаваць магілёўскія кніжныя манбланы. І галоўнае — ніколі не дапускаць іх узнікнення.

Я. ДАНСКАЯ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

За заслугі ў развіцці савецкага тэатральнага мастацтва і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння народная артыстка Беларускай ССР, артыстка Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Бялінская Марыя Сяргееўна ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.



На будаўніцтве галоўнага корпуса ДРЭС. Тут працуе стотонны кран.

А гэта жылыя дамы для будаўнікоў ДРЭС.



Бетонна-растворны вузел.

НА РУБЯЖАХ ПЯЦІГОДКІ

ЛУКОМЛЬСКІЯ ЭЦЮДЫ



Электразваршчыкі на будаўніцтве бетонна-растворнага вузла.

Гэта была хвалюючая паездка. Група беларускіх жывапісцаў і графікаў наведала будаўніцтва Лукомльскай ДРЭС. Мы пісалі там эцюды, рабілі замалёўкі, знаёміліся з цікавымі людзьмі.

Як і пасля кожнай паездкі, сабралася мноства свежых уражанняў. Жыццё, як кажуць, паставіла многа новых пытанняў, на якія трэба шукаць адказу.

Нас, мастакоў, асабліва ўразілі кантрасты старога і новага: побач з маленькімі вясковымі хатамі расце сапраўдны горад. У Лукомлі будуюць двухпавярховыя мураваныя дамы, пракладваюць тратуары. Дзесяткі вежавых кранаў узняліся ў неба на будаўніцтве ДРЭС. Сярод іх магутны волат, які адразу падымае сто тон. Аўтамашыны, самазвалы, бульдозеры — колькі іх тут!..

Велічная панарама сучаснай будоўлі, якая разгарнулася больш як на сем кіламетраў у маляўнічых мясцінах каля Лукомльскага возера, падказвае цікавыя, нечаканыя выяўленчыя рашэнні нашых работ. Для мяне як для графіка, у чым арсенале пераважна два колеры — чорны і белы, было цікава замалёўваць кантрасныя карціны будаўніцтва асноўных карпусоў, праводку тунельных адводаў для высакавольтных кабеляў, розныя моманты на будаўніцтве бетонна-растворнага вузла, на пракладцы чыгункі для падвозкі матэрыялаў.

Цікавыя сюжэты для кампазіцый тут на кожным кроку. Вось хоць бы нараджэнне жылога гарадка для будаўнікоў — дамы сучаснай архітэктуры, дзіцячы сад, Дом культуры, навасёлы ў вялікіх дамах...

Мы жылі ў інтэрнаце ў часовым пасёлку Піянерскі. Кожную раніцу, захапіўшы мальберты, эцюднікі, паперу, палатно, фарбы, вугаль, разам з рабочымі ішлі на будоўлю. Кожны вечар адзін перад адным рабілі творчую справаздачу, абмяркоўвалі эскізы, замалёўкі. Знаёміліся з нашымі работамі будаўнікі ДРЭС. Прыходзілі да нас параіцца і мясцовыя самадзейныя мастакі, прыносілі свае работы на кансультацыю.

Мы імкнуліся замаляваць усё — і магутную тэхніку, і каларытныя мясцовыя пейзажы, і людзей будоўлі. Некаторыя са сваіх замалёвак я прапаную ўвазе чытачоў.

На будоўлі мы сустрэлі нашых калег — віцебскіх мастакоў А. Каржанеўскага, Л. Мішурнага і В. Ціханенку. Яны робяць насценны роспіс у новым будынку дзіцячага сада.

І Г. Бржазоўскі, І С. Андруховіч, І А. Сямілетаў, І В. Ткачук, І я, апроч індустрыяльных пейзажаў, імкнуліся таксама занатаваць у сваіх творах людзей будоўлі. З тых, каго мы малявалі, мне асабліва запомніўся Фёдар Баранаў — брыгадзір арматуршчыкаў. Валявы, сабраны чалавек сярэдняга веку. Вельмі сімпатычны. З багатай працоўнай біяграфіяй. І яшчэ мы малявалі брыгадзіра тынкоўшчыкаў Вольгу Гранкову, шафёра А. Рускага, экскаватаршчыка Я. Ласкіна, слесара-трубаправодчыка П. Барсукова, бульдазерыста В. Крыцкага, брыгадзіра цесляроў І. Спірыдонава, электразваршчыка С. Дораша, брыгадзіра электрамантажнікаў М. Сцяпанава, цесляра В. Лахуцько. Усё гэта розныя па характарах, вельмі цікавыя людзі, цудоўныя працаўнікі.

Партрэты лепшых людзей будоўлі мы падаравалі Лукомльскай ДРЭС для галерэі выдатнікаў будаўніцтва.

У часе паездкі мы сабралі багаты матэрыял. Цяпер ёсць над чым папрацаваць у майстэрні.

Ул. САКАЛОЎ,
мастак.

Вядуцца тунельныя адводы для высакавольтных ліній.

ЛІТОЎСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ— ПРА БЕЛАРУСЬ

У Вільнюсе выйшаў у свет першы том «Малой Літоўскай Савецкай Энцыклапедыі» (МЛСЭ). Карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» звярнуўся да загадчыка аддзела рэдакцыі МЛСЭ Вальдэмараса Кветкаўскаса з просьбай расказаць пра гэтае выданне.

— Літоўская энцыклапедыя, —сказаў В. Кветкаўскас, —будзе складацца з трох тамоў, у якіх мяркуецца змясціць каля 20 тысяч артыкулаў. У ёй будуць адлюстраваны мінулае і сённяшні дзень літоўскага народа. Выданне раскажа пра эканоміку, культуру, мастацтва, прыроду Літоўскай ССР.

Працуе над энцыклапедыяй шматлікі калектыў вучоных розных галін ведаў, грамадска-палітычных дзеячоў, спецыялістаў народнай гаспадаркі і культуры. Галоўны рэдактар МЛСЭ — прэзідэнт Акадэміі навук Літоўскай ССР Юозас Матуліс.

— Як вядома, у гісторыі літоўскага народа шмат агульнага з гісторыяй Беларусі. І зусім натуральна, што ў энцыклапедыі нямала матэрыялаў, прысвечаных Беларусі. Змешчаны, напрыклад, грунтоўны артыкул «Беларуская мова». У ім падкрэсліваецца, што беларуская мова ў XIV—XVII стагоддзях была дзяржаўнай пісьмовай мовай Вялікага княства Літоўскага.

Вялікі артыкул прысвечаны беларускай літаратуры. Чытачы даведаюцца пра літоўска-беларускія літаратурныя сувязі, пра тое, што ў газеце «Раўданасіс артоясс» («Чырвоны араты»), якая выходзіла ў 1932—36 гг. у Мінску, друкаваліся творы беларускіх савецкіх пісьменнікаў у перакладах на літоўскую мову.

Ёсць у першым томе артыкул «Беларуская сялянска-рабочая трамада» і іншыя матэрыялы, прысвечаныя Беларусі.

Вось і скончыўся танец... Гледачы выклікалі танцораў на «біс», праводзілі іх за кулісы гарачымі воплескамі. Апладзіравалі і ім, тром сяброўкам, — Тамары Сазонавай, Тамары Дзягілевіч, Галі Дубаневіч. Таму так радасна і ўсміхаюцца дзяўчаты. У іх гэтых хвілін радасці было ўжо шмат. Дзяўчаты выступаюць на самадзейнай сцэне Дома культуры Магілёўскай швейнай фабрыкі імя Валадарскага больш трох гадоў. Дзве Тамары, Галя, як і ўсе сябры з іх танцавальнага калектыву, — удзельніцы фестывалю самадзейнага мастацтва.

Фота Л. ШАСТАКОВА.

У ЗАСЕНІ БЫЛОЙ СЛАВЫ

У Мазыры рыхтаваліся ўрачыста адзначыць дваццацігадовы юбілей гарадскога хору. Ужо былі заказаны запрашальныя білеты, складзены спісы гасцей — іх чакалася шмат. Прыязджалі карэспандэнты, каб не спазніцца з артыкуламі пра юбіляра. Хор сапраўды заслугоўваў таго, каб пра яго пісалі,—у яго багаты самабытны рэпертуар, аснову якога складалі беларускія народныя песні. З поспехам выступаў ён на шматлікіх аглядах мастацкай самадзейнасці і з поўным правам лічыўся адным з лепшых на Гомельшчыне.

Але свята ў Мазыры не адбылося. Яго арганізатары і ініцыятары не ўлічылі адной акалічнасці — незадоўга да юбілею хор фактычна спыніў сваё існаванне. Прычына — калектыў застаўся без кіраўніка. У справаздачах, што паступаюць з Мазыра, харавы калектыў фігуруе і цяпер, але ўсе ведаюць, што гэта—«па інерцыі».

У Мазыры, дзе ёсць музычная школа з 25 выкладчыкамі, дзе ў педагагічным інстытуце ёсць кафедра музыкі, не знайшлося кваліфікаванага і зацікаўленага кіраўніка для гарадскога хору. Паверыць у гэта цяжка. Мне прыгадваецца другі калектыў—народны хор рускай песні Рэчыцкага фанерамэблевага камбіната. Ён таксама ў свой час апынуўся ў такім жа цяжкім становішчы. І хоць у Рэчыцы спецыялістаў-музыкантаў менш, чым у Мазыры, кіраўніка хутка знайшлі, і калектыў паспяхова выступіў у Мінску на III Дэкадзе народнай творчасці. І цяпер тут ідзе напружаная работа, хор не толькі не страціў сваёй высокай культуры, але ўзбагаціў яе. Да фестывалю самадзейнага мастацтва тут рыхтуецца новая праграма.

А ў Мазыры — зацішша. Пра фестываль не чулі і не ведаюць. Гэта, вядома, перабольшанне—палажэнне аб фестывалі тут ёсць, але я ніяк не магу пазбыцца думкі, што гэтага палажэння тут не чыталі. Ва ўсякім разе, я чакаў, што атрымаю ад гарадскога канцэрта ў Дзень моладзі, на якім мне давялося прысутнічаць, хоць бы прыблізнае ўяўленне аб будучай фестывальнай праграме, у якой галоўнае месца павінны заняць творы мастацтва нашай рэспублікі і якія, вядома, павінны быць з густам пастаўлены і афармлены.

Зала канцэрта выглядала грандыёзна — сотні гледачоў сабраліся ў парку на беразе ракі. Але паказалі ім некалькі экзатычных танцаў ды некалькі эстрадных песенак. За паўтары гадзіны не было выканана ніводнага беларускага танца або песні.

У гарадскім аддзеле культуры мне растлумачылі, што, маўляў, у праграме былі беларускія нумары, але, на жаль, не прыйшлі выканаўцы. Аказваецца, пад гэтым мелі на ўвазе адзін верш на беларускай мове, якога так і не прачыталі.

Аргкамітэт па падрыхтоўцы да фестывалю, які быў зацверджаны ў канцы чэрвеня, работы як след не разгарнуў. Журы гарадскога агляду мастацкай самадзейнасці зімою гэтага года адзначыла, што ў рэпертуары калектываў вельмі слаба гучыць патрыятычная тэма, надзвычай мала беларускіх твораў. У пагоні за «модай» мазыране, бадай, апярэдзілі ўсіх—тут да гэтага часу аснову рэпертуару складаюць бразільскія, аргенцінскія, іспанскія танцы і пасрэдныя паўтарэнні леташніх эстрадных песень.

У пераважнай большасці раённаў вобласці ідзе спаборніцтва за лепшае абслугоўванне працаўнікоў вёскі канцэртамі мастацкай самадзейнасці. У Брагінскім раёне, напрыклад, канцэрты адбыліся — і не адзін—ва ўсіх населеных пунктах. Мазырскі ж раённы аддзел культуры здолеў арганізаваць за год усяго трыццаць два канцэрты ў дваццаці васьмі вёсках з васьмідзесяці дзевяці.

У многіх раёнах Гомельскай вобласці разгарнулася актыўная падрыхтоўка да фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады. Толькі за апошні час створана 70 самадзейных харавых, танцавальных і музычных калектываў, за паўгода дадзена звыш чатырох з палавінаю тысяч канцэртаў, шмат робіцца для ўмацавання матэрыяльнай базы сельскіх клубаў і па падрыхтоўцы спецыялістаў культасветработы, створаны рабочыя групы па розных жанрах, куды ўвайшлі метадысты Дома народнай творчасці і спецыялісты—музыканты, мастакі, акцёры тэатра.

Але вось іншыя факты. У 1964 годзе ў Кармянскім Доме культуры працавала дзевяць гурткоў мастацкай самадзейнасці, цяпер усяго пяць; у Азершчынскім Доме культуры колькасць гурткоў з сямі скарацілася да трох; усяго чатыры гурткі працуюць у Добрушскім раённым Доме культуры — у танцавальным займаецца пяць чалавек, у драматычным — шэсць. Тут нельга сур'ёзна гаварыць пра рэпертуар, майстэрства, творчы рост.

Некаторыя калектывы мастацкай самадзейнасці Гомельшчыны замест таго каб дамагацца новых творчых поспехаў, хаваюцца ў засень былой славы і пачынаюць траціць заваяваныя рубяжы.

Д. РАДЗІНСКІ,
карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва».

ДОБРЫЯ СПРАВЫ АГІТБРЫГАДЫ

У клубе вёскі Міхалёва Магілёўскага раёна з найбольш актыўных і таленавітых самадзейных артыстаў створана агітбрыгада. За паўтара года яна больш за сто разоў выязджала ў калгасы.

Рэпертуар у Міхалёве ствараюць калектыўна. Кожны факт мясцовага жыцця абмяркоўваецца разам з партыйнай і камсамольскай арганізацыямі, праўленнем калгаса. А потым на яго аснове ўдзельнікі брыгады пішуць частушкі, куплеты, сцэнкі, інтэрмедыі. Добрыя складаюць частушкі Валерый Ліпкін і Марыя Гаўрылава.

У выступленнях агітбрыгады бічуюцца віноўнікі недахопаў, парушальнікі працоўнай дысцыпліны, адсталыя калгаснікі. Усе крытычныя нумары ў праграме выконваюцца пры дапамозе так званага «тэлевізара». Гэта высокая, акуратна зробленая фанерная скрынка, якая нагадвае корпус тэлевізара з вялікім экранам. У сярэдзіне абсталяваны два валікі, на якіх намотваецца папяровая стужка з «кадрамі» — малюнкамі, здымкамі і карыкатурамі. Зверху, на палічцы, ставіцца магнітафон, на якім запісана ўся перадача.

У сельскім клубе ёсць сшытак з водгукамі аб рабоце агітбрыгады. Пішуць калгаснікі, рабочыя і служачыя, настаўнікі, спецыялісты сельскай гаспадаркі.

Ёсць і другі сшытак, таўсцейшы за першы. У ім сабраны ўсе частушкі, якія выконваліся агітбрыгадай. Іх больш за сто. У гэтым жа сшытку каля дзесятка пародый, напісаных на мясцовыя тэмы на музыку папулярных песень. Аўтары пародый — члены агітбрыгады.

Творчая біяграфія гэтага калектыву багатая добрымі справамі.

Цяпер агітбрыгада Міхалёўскага сельскага клуба рыхтуецца да ўсесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва. Новая праграма канцэрта паказваецца ў полі, там, дзе людзі працуюць на ўборцы збожжа.

А. ГОЛЫШ,
старшы метадыст Магілёўскага абласнога Дома народнай творчасці.

ПРЭМІІ—ЛЕПШЫМ

Шчырай павагай сярод калгаснікаў Сормаўскага сельсавета Чэрыкаўскага раёна карыстаецца кінамеханік Іван Брылёў. На сеансах, якія ён паставіў за шэсць месяцаў, пабывала больш як 10 тысяч гледачоў. Ён рэгулярна дэманструе не толькі мастацкія, але і хранікальна-дакументальныя, сельскагаспадарчыя фільмы.

Кожны месяц перавыконвае планы паказу фільмаў і ўдарнік камуністычнай працы Міхаіл Вераб'ёў, які абслугоўвае хлебаробаў Рэчыцкага сельсавета. За выдатную працу перадавыя кінамеханікі атрымалі прэміі.

К. МІХАЙЛАЎ.

ПЕСНІ НАД ПОЛЕМ

У калгасах імя Леніна, «Кастрычнік», імя Будзённага, саўгасах «Ганчанскі», «Красінскі», «Ня-ята» і ў кожнай іншай гаспадарцы Клічаўшчыны з радасцю сустракаюць прыезд агітбрыгады раённага Дома культуры.

Толькі з вясны брыгада зрабіла больш як 20 выездаў у калгасы і саўгасы. Яе ўдзельніцы выступаюць непасрэдна там, дзе працуюць людзі,—на полі, на лузе.

І гэтымі днямі калектыў наведаў саўгас «Нясята». Член раённага таварыства «Веды» Леанід Петэрсон зрабіў перад рабочымі даклад аб бягучым моманце і ходзе ўборкі ўраджаю ў раёне. Самадзейныя артысты пад кіраўніцтвам дырэктара Дома культуры Андрэя Хромчанкі выканалі песні, цікавыя танцавальныя нумары, сатырычныя куплеты на мясцовыя тэмы.

М. ЦІШКОЎ.

ДЗЯДУЛЯ-ЧАПАЕВЕЦ

У клубе саўгаса «Валосавічы» Лепельскага раёна адбыўся вечар сустрэчы трох пакаленняў. Сюды прыйшлі тыя, хто заваёўваў Савецкую ўладу, хто пераводзіў сельскую гаспадарку на сацыялістычны лад, а таксама сённяшняя моладзь — трактарысты, паляводы, жывёлаводы...

З цікавасцю праслухалі прысутныя выступленне пенсіянера А. Парфяновіча. Ён расказаў пра свой удзел у грамадзянскай вайне, пра сустрэчу з легендарным Чапаевым, пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. І. Шырко падзяліўся ўспамінамі пра нараджэнне ў гэтых мясцінах калгаса, першым старшынёй якога ён быў.

М. КАНСТАНЦІНАЎ.

ПАЧУЦЦІ БРАТНЯЙ ЛЮБВІ

Беларусь наведаў асецінскі паэт Аляксандр Пухаеў. Ён збірае матэрыял для аповесці аб партызанах-асецінах, якія змагаліся з фашызмам на беларускай зямлі.

З Беларуссю ў Аляксандра Пухаева даўнія сувязі. Некалькі гадоў ён займаецца перакладамі на родную мову твораў беларускіх паэтаў і празаікаў. Цяпер, у прыватнасці, ён працуе над перакладамі вершаў нашых маладых паэтаў для зборніка беларускай паэзіі на асецінскай мове.

Змяшчаем тры вершы нашага госця ў перакладзе на беларускую мову Генадзя Кляўко.

СЛОВА ПРА БЕЛАРУСЬ

Я тваёй красой зачараваны,
Добрая, гасцінная зямля.
Тут стагоддзі дрэмлюць
у курганах,
Рэхам адгукаюцца здаля.

Лёс твой быў, як і тваё надвор'е:
То хадзілі хмары хадуном,
То свяціла сонца у прасторах,
З ласкай зазірала ў кожны дом.

Колькі слаўных подзвігаў вячыстых
Мае гераічны твой народ!—
Быццам хваль на Нёмане
празрыстых
Ці над нівай ва ўраджайны год.

Вораг па тваіх хадзіў гасцінцах,
І дачасна аблятаў твой сад.
Да цябе з мячом ішлі чужынцы,
Толькі не вярталіся назад.

Колькі раз ты слёзы пралівала,
Ды скарыцца, знаю, не магла.
Помста твая полымем шугала—
У ім згаралі ворагі датла.

Многа мук і болю ты сцярпела.
А сягоння раны зажылі.
Толькі іх сляды відны на целе
Скрозь і ўсюды на тваёй зямлі.

Іх сляды — ў лясах ірвы сівыя,
Іх сляды—магілы ля дарог,
Абеліскі—сведкі векавыя,
Сведкі неўміручых перамог.

Шчасных год табе зязюлі зычаць
У хадзе да велічных падзей.
Ты заўсёды ў форме будаўнічай
Робішся з гадамі маладзей.

Чую звонкіх птушак над табою,
Песні іх зліліся з шумам рэк,
З шумам нарачанскага прыбою,
З шумам пушчаў і лясоў навек.

Славілі цябе не раз паэты,
Толькі песні шчэ такой няма,
Каб была ты да канца апета,
Бо такая песня—ты сама.

У МУЗЕІ ЯКУБА КОЛАСА

Сюды прынёс я нізкі свой паклон.
Заходжу ў дом з затоеным
дыханнем.
Вось зараз сам насустрач выйдзе
ён
І мне падасць руку для
прывітання...

Ды цішыня вяртае з забыцця—
З жывымі мёртвы гаварыць
павінен...
У кожнай літары—натхнёны міг
жыцця,
У словах—неўміручыя хвіліны.

Цяпер жа тут адзін і той жа час
Паказвае гадзіннік бестурботны.
А вочы з клопатам глядзяць
на нас
І гэтак просяць часу і работы...

Пісьмо закончыць не паспеў паэт.
Дый песню ён няскончанай
пакінуў...
Нас запрасіў гасцінна ў кабінет,
А сам, здаецца, выйшаў на хвіліну.
Чытаюць сёння тысячы вачэй
Пісьмо, што не дайшло
да адрасата...
Твой дом, пясняр, стаў родным
для людзей.
Прымі ж паклон ад асеціна-брата.

ПАЭЗІЯ І СЭРЦА

Прырода сэрца мне дала,
Каб мераць шлях свой поўнай
мерай,
Каб паўнаўладна ў ім жыла
Надзея светлая і вера.

Прырода сэрца мне дала,
Каб шар зямны не быў мне цесны,
Каб, стаўшы променем святла,
Яно імчала разам з песняй.

Прырода сэрца мне дала,
Каб узнімацца на вяршыні,
Каб вечна спела і расла
У ім любоў мая к Айчыне.

Кнігі, якія адбірае супрацоўніца Івянецкай гарпасяковай бібліятэкі Валожынскага раёна Тамара Мартынаўна Рагаткіна, — для тых, хто сёння ў полі. Пакункі давозяць у калгасы «Верны шлях», «Рассвет», саўгасы «Радзіма», імя Маякоўскага і іншыя. 16 сельскіх кнігаперасовак абслугоўвае гарпасяковая бібліятэка.

Фота Я. МАКОЎСКАГА.

ШЧЫРЫЯ АПЛАДЫСМЕНТЫ

Не толькі жыхары Маладзечна, але і хлебаробы раёна, рабочыя торфабрыкетнага завода «Бярэзінскае» пабывалі на канцэртах Дзяржаўнага ансамбля песні і тэнца Беларускай ССР пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтва БССР Аляксандра Апанасенкі. Яны цёпла апладзіравалі таленавітаму калектыву, які яшчэ раз паказаў прыгажосць і грацыю беларускіх, рускіх, украінскіх танцаў.

І ЯШЧЭ РАЗ ПРА ШПАЛЕРЫ

На сённяшні дзень распрацавана тэхналогія вырабу шпалераў самага разнастайнага прызначэння. Некаторыя з новых узораў вызначаюцца высокімі якасцямі — яны ўстойлівыя да вільгаці, добра захоўваюць колер. Адны з іх — рэльефныя, другія — плёначныя. Імі можна аздабляць жыллё, вытворчыя і грамадскія інтэр'еры, чыгуначныя вагоны, судны марскога і рачнога транспарту, памяшканні гасцініц, рэстаранаў, кафэ і г. д.

Зразумела, што шпалеры павінны, апроч высокіх тэхнічных якасцей, мець высокія эстэтычныя вартасці.

Якраз пра гэта і хочацца павесці гаворку.

А што такая гаворка наспела, сведчыць і праведзены ў Мінску ў ліпені семінар, арганізаваны навукова-тэхнічным таварыствам Міністэрства лясной, папяровай і дрэваапрацоўчай прамысловасці СССР. Праграма семінара—«Пашырэнне асартыменту і паляпшэнне якасці шпалераў (абмен вопытам)»—выклікала шэраг цікавых разваг аб шпалерах як частцы інтэр'ера жылых памяшканняў, аб новых відах рулонных матэрыялаў, аб перспектывах выкарыстання шпалераў у будаўніцтве. У час семінара Усесаюзны павільён лепшых узораў тавараў народнага ўжытку наладзіў выстаўку вартых увагі замежных узораў шпалераў і пазнаёміў удзельнікаў семінара з тэхналогіяй іх вытворчасці. Адначасова паказвалася айчынная прадукцыя 1965 года і першага квартала 1966 года. Якасць гэтай прадукцыі, істотныя яе недахопы і шляхі іх пераадолення аналізаваліся на семінары прадстаўнікамі шпалерных фабрык Масквы, Ленінграда, Рыгі, Мінска, Волагды, Адэсы, Тбілісі.

Хацелася б спадзявацца, што семінар прынясе пэўную карысць.

На жаль, пакуль што нашы прадпрыемствы шмат у чым не разумеюць характару сучаснай вытворчасці шпалераў, сучасных патрабаванняў да іх. Ёсць усе падставы папракнуць у гэтым Мінскую фабрыку.

Чым, напрыклад, адрозніваюцца мінскія шпалеры ад прадукцыі фабрык Ленінграда, Масквы, Рыгі? Яны такія ж аднастайныя, а часта проста капіруюць танныя замежныя ўзоры. Мінская фабрыка працуе ў асноўным па зацверджаных усесаюзных эталонах, па эскізах, распрацаваных маскоўскімі мастакамі. А дзе ж сваё, адметнае, нацыянальнае?

Штампуючы часам кіламетры нудных па матывах шпалераў, створаных без усякага ўліку таго, які інтэр'ер яны ўпрыгожаць, фабрыка тым самым парушае вельмі прынцыповае патрабаванне да якасці прадукцыі. Паколькі шпалеры — неад'емная частка інтэр'ера, яны павінны гарманічна спалучацца з яго формай, колерамі, спецыфічным прызначэннем. Гэтая гармонія павінна вызначацца не толькі каларытам, але, калі хочаце, і тэматыкай. Малюнак, кампазіцыя, графічнае выкананне шпалераў, прызначаных для нейкага пэўнага інтэр'ера, павінны несці адпаведную сэнсавую нагрузку. А як жа ты выканаеш гэтае патрабаванне, калі адны і тыя ж шпалеры прапануюцца ў якасці універсальных для любога памяшкання?!

Мінская фабрыка першая са шпалерных прадпрыемстваў краіны рэканструявана, абсталявана імпартным каштоўным абсталяваннем з ГДР і ФРГ. Тут пабудаваны новы вытворчы корпус. Новым айчынным абсталяваннем аснашчаны цэх прыгатавання фарбаў. Увогуле фабрыка сёння мае ўсё неабходнае для таго, каб заняць вядучае месца ў краіне. Вядома, не ўсё залежыць ад самога калектыву фабрыкі. Пастаўшчыкі не забяспечваюць прадпрыемства высокаякаснымі матэрыяламі. З завода паліграфічных вырабаў пастаўляюцца нізкай якасці пасты, якія не забяспечваюць дабраякаснага друкавання шпалераў. Каалін фабрыка атрымлівае толькі другога і трэцяга гатунку. Даўно наспеў час перайсці на новыя фарбавальнікі, улічыўшы вопыт такіх замежных краін, як ГДР. Цяпер гэта магчыма, бо мы маем новае абсталяванне.

Прадпрыемства дрэнна забяспечваецца паперай. Яно атрымлівае паперу слабую на разрыў, якая пры наклейцы прапускае вільгаць. Пакуль яшчэ няма абсталявання для вытворчасці плёначных шпалераў, а патрэба ў іх у нашай рэспубліцы вялікая.

За апошні час на фабрыцы зроблена сёе-тое для надання мастацкай выразнасці шпалерам, паляпшэння колеру, фактуры, малюнка. Амаль на 80 працэнтаў абноўлены графічны малюнак. Зняты з вытворчасці дывановы малюнак, расфарбоўка ў выглядзе ружаў, зусім нехарактэрных для нас пальмаў і г. д. Але што створана новае, сваё? Аказваецца, нічога. Фабрыка вымушана працаваць па «чужых» — набытых за межамі рэспублікі — эскізах (эталонах).

Фабрыка мае ў сваім штаце кваліфікаваных інжынераў, тэхнолагаў, а вось мастак па штатнаму раскладу не прадугледжаны. Праўда, залічаны старшым майстрам на фабрыку мастак Ул. Бараноўскі. Ён мае добры густ, высокую кваліфікацыю. Добры мастак, але—адзін. А адзін, як вядома, у полі не воін. Бо мала таго, што з-за адсутнасці мастака ў штаце фабрыка нават фармальна не мае права распрацоўваць свае эскізы, адзіны мастак проста не паспявае справіцца са сваімі абавязкамі—ён павінен кантраляваць наборы на друкарскія валы, пуск награвіраваных малюнкаў у вытворчасць. Дзе ўжо тут думаць пра новыя эскізы!..

У штаце фабрыкі павінна быць не менш двух-трох мастакоў. Гэтага патрабуе жыццё, патрабуе характар вытворчасці. Павінна быць на фабрыцы мастацкая лабараторыя, у якой вяліся б работы па стварэнню новых узораў шпалераў.

Да распрацоўкі эскізаў новых узораў трэба прыцягваць беларускіх мастакоў. Секцыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Саюза мастакоў БССР павінна ўзяць распрацоўку эскізаў шпалераў пад свой кантроль. А можа варта нават аб'явіць адпаведны конкурс. Пры гэтым ва ўмовах конкурсу трэба было б спецыяльна агаварыць патрабаванні да тых ці іншых эскізаў, прызначаных для канкрэтных інтэр'ераў.

Багацце народных нацыянальных матываў у нашым выяўленчым фальклоры, распрацаваныя сучасныя дэкаратыўныя формы ў творчасці майстроў прыкладнога мастацтва нашай рэспублікі — невычарпальная крыніца для стварэння адметных і высокамастацкіх шпалераў.

І, вядома, нельга не сказаць пра мастацкі савет, які ацэньвае прадукцыю фабрыкі. У яго склад уваходзяць і архітэктар, і прадстаўнік Дзяржбуда, і работнікі фабрыкі, і прадстаўнікі гандлю. Але... ніводнага мастака. А між тым фабрыка прасіла праўленне Саюза мастакоў выдзеліць мастака ў склад гэтага савета.

Ф. ВАЛАДЗЬКО.
загадчык навучальнай часткі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута.

Прыемна адпачываць на ўлоньні прыроды, а яшчэ калі можна паслухаць канцэрт,— настрой становіцца зусім добры. У Магілёве, у Пячэрскім лесапарку, кожную нядзелю выступаюць самадзейныя артысты. Іх канцэрты нязменна збіраюць вялікую аўдыторыю.

На здымку, які зрабіў М. Рубінштэйн, перад гледачамі выступаюць артысты народнага тэатра Магілёўскага Дома культуры чыгуначнікаў Юлія Дзянісава і Яўген Лаўрэнцьеў.

АД РЭДАКЦЫІ. Газета «Літаратура і мастацтва» ўжо неаднаразова звяртаецца да пытання тэхнічнай і мастацкай якасці нашых шпалераў, да становішча на Мінскай фабрыцы. Многае, аб чым піша Ф. Валадзько, было тэмай гаворкі ў артыкулах, якія друкаваліся раней. Так, мастак С. Акуліч у артыкуле «Справа не ў тэхналогіі, а ў гусце» («Літаратура і мастацтва» ад 27 жніўня 1963 г.) пісаў: «Арыгіналы... фабрыка атрымоўвае з цэнтральных мастацкіх майстэрань Масквы—тое, што не бяруць сталічныя фабрыкі. Сваёй жа мастацкай майстэрні, дзе працаваў бы калектыў мастакоў, добра знаёмых з гэтай справай, з нацыянальнай культурай беларускага народа, з яго багатымі самабытнымі традыцыямі мастацтва,— тут няма». І далей: «Не на вышыні свайго становішча знаходзіцца і мастацкі савет... І гэта не дзіва, бо ён складаецца ў асноўным з тэхнічных, гаспадарчых і гандлёвых работнікаў, а не з мастакоў і архітэктараў».

Архітэктар В. Аладаў у артыкуле «Кіламетры эстэтычнага браку» («Літаратура і мастацтва» ад 26 чэрвеня 1964 г.) таксама адзначаў: «Неабходна тэрмінова стварыць пры фабрыцы мастацкі савет, у які б увайшлі як прадстаўнікі вытворчасці, так і архітэктары, мастакі, аддзелачнікі. Гэты савет павінен перагледзець асартымент шпалераў...»

І вось мы ізноў вымушаны вяртацца да сказанага раней.

З артыкула Ф. Валадзько добра відаць, што на Мінскай шпалернай фабрыцы, нягледзячы на шэраг зрухаў (новае абсталяванне, частковы перагляд асартыменту), вельмі многае засталося па-старому.

Да гэтага часу так і не з'явілася прадукцыі, якая б, як слушна піша Ф. Валадзько, несла рысы нашай беларускай савецкай нацыянальнай культуры. Да гэтага часу не ўкамплектаваны як след мастацкі савет. На фабрыцы, якая непасрэдна занята стварэннем прадукцыі, заклікана эстэтычна ўздзейнічаць на людзей, працуе толькі адзін мастак, ды і то, як кажуць, «падпольна».

Выступаючы трэці раз па адным і тым жа, па сутнасці, вельмі прынцыповым пытанні, мусім суцяшацца старадаўняю прыказкаю: кропля камень дзяўбе не сілаю, а частым падзеннем...

Хочацца спытаць у кіраўнікоў фабрыкі: калі ж, нарэшце, становішча зменіцца карэнным чынам?

У майстэрнях мастакоў

КАЛІ АЖЫВАЕ ФАРФОР

Малады мастак Мінскага фарфоравага завода Валерый Леантовіч працуе ў розных матэрыялах. Цікавыя яго работы ў маёліцы, шамоце. Але, бадай, найбольш поўна таленавітасць, творчая фантазія, адчуванне матэрыялу раскрыты ім у творах з фарфору.

Лірычнасць, музычнасць рытму адчуваюцца ў мяккіх, абцякальных формах прадметаў, створаных В. Леантовічам. Пяшчотную белізну фарфору ён падкрэслівае дэкорам. Іменна дэкор, трапна выкарыстаны мастаком, выразна падкрэслівае пластыку прадметаў і ў спалучэнні з формай надае ім нацыянальны каларыт.

Майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, памятаючы, што рэч перш за ўсё павінна быць карыснай, зручнай, павінен улічваць патрэбу ў рэчы, якую стварае, лічыцца з асаблівасцямі быту, традыцыяй народа. В. Леантовіч добра ўсведамляе гэта.

Формы шматлікіх вырабаў прадметаў быту, выкананых мастаком, практычныя, мэтазгодныя, прыгожыя па сілуэту. У іх выразна адчуваецца нацыянальны каларыт. Такія сервізы для стала, вазы для кветак, дэкаратыўныя вазы і розныя прадметы быту распрацаваны В. Леантовічам.

Вось чайны сервіз «Вясенні». На пяшчотна белай прыгожай паверхні прадметаў прыгожа размешчаны сціплы дэкор — двайныя лісткі. Удала знойдзены прапорцыі, размяшчэнне, суадносіны пяшчотна-зялёнага колеру з залацістым ствараюць настрой вясенняй свежасці, святочнай прыгажосці.

Адпавядае сваёй назве сервіз «Беларусь», у якім умела выкарыстаны беларускія арнаментальныя матывы. Мажорны сакавіты роспіс гарманіруе з формай прадметаў.

Трэба сапраўды валодаць мастацкім густам, каб простую бытавую рэч зрабіць творам мастацтва. Вось хоць бы кубак з фарфору. Мастак закругляе донную частку, плаўным выгібам ручкі паўтарае контур ніжняй часткі — і ўвесь сілуэт кубка непазнавальна мяняецца. Форма дапоўнена сціплым дэкорам у верхняй частцы кубка—крузочкі чырвонага колеру, якія чаргуюцца з залацістымі палоскамі, размешчаны па вертыкалі. Мастак назваў свой твор «Парэчкі».

Нямала створана В. Леантовічам і кашпо самай рознай формы і колеру. Яго падвеснае кашпо «Слуцкае» выканана ў фарфоры. Прадаўгаватасць формы падкрэсліваецца чырвонымі падоўжанымі палосамі ад верхняга абадка да донца. Дэкор абадка—невялікія чырвоныя кружочкі, якія нагадваюць па колеру і форме вішні, злучаныя залатымі лініямі. Яны ўтвараюць правільныя трохкутнікі, ствараюць выразны рытм. Гэтае кашпо прыдатнае для любога інтэр'ера.

Паспяхова працуе В. Леантовіч і над стварэннем ваз для кветак. Прыгожыя яго вазы «Кукуруза» (фарфор, надглазурны росліс), «Беларусь» (маёліка). У гэтых вазах мастак і ў форме і ў колеры звяртаецца да народных традыцый. Мы бачым іх тут у адсутнасці рэзкіх кантрастаў, у такіх спакойных суадносінах колераў, адценняў, як і ў самой беларускай прыродзе.

Пачуццём сучаснасці прасякнуты дэкаратыўныя вазы, створаныя В. Леантовічам. Арыгінальныя, свежыя і па форме, і па дэкору яго вазы «Юнацтва» (фарфор), «Сучасны Мінск» (фарфор), «Касманаўты» (фарфор), напольныя вазы «Дрэва» і «Квадратная» (абедзве ў шамоце).

Ствараючы прадметы быту, мастак шукае новыя, мэтазгодныя сучасныя формы вырабаў, звязвае іх з іншымі прадметамі ў інтэр'еры. Прыкладам можа служыць начнічок «Месяц» (фарфор), распрацаваны па заказе Лідскага электратэхнічнага завода. Начнічок вырашаны ў форме паўмесяца. На корпусе — банавыя выразы. З густам прыменена светла-зялёная найма, якая паўтарае форму корпуса.

В. Леантовіч не задавальняецца тым, што ўжо аднойчы ўдала ім знойдзена. Імкнучыся глыбока спасцігнуць сакраты прыгажосці, ён звяртаецца да стварэння самых розных прадметаў. Адсюль шырыня яго творчага дыяпазону. Яго цікавіць вырашэнне самых разнастайных задач. Таму ён бярэцца за стварэнне і кубкаў для мінеральнай вады для санаторыя «Друскеніні», і набору штофаў для «Зуброўкі», і за сасуды «Рабіна на каньяку» і «Мінскі дэсерт». Яго работы адзначаюцца на конкурсах, карыстаюцца поспехам на рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаўках, адбіраюцца для экспазіцыі савецкіх павільёнаў на выстаўках за рубяжом.

Мастак часта звяртаецца да тэм юнацтва, спорту, мацярынства. Серыю памятных разетак ён прысвяціў Усесаюзнай спартакіядзе школьнікаў 1965 года ў Мінску. Яны самыя розныя па форме. У кожнай добра знойдзены памер. Надглазурны росліс кобальтам прыцягвае ўвагу да добра ўкампанаванага малюнка, пададзенага прыгожым, выразным сілуэтам (вясляр, баскетбаліст, валейбаліст і г. д.).

Цёпла былі сустрэты на выстаўцы «Мастацтва дзецям» (1965) дэкаратыўныя пано В. Леантовіча «Сонца», «Вясна», «Хай заўжды будзе мама». У гэтай серыі мастак звяртаецца да грубага шурпатага шамоту і каляровых эмаляў. Пад рукой мастака матэрыял ператвараецца ў прыгожае па фактуры, па колеру пано. Знаёмая тэма «Хай заўжды будзе мама» гучыць па-новаму, вобразна і выразна. Амаль усю плоскасць пано займае адлюстраванне маці з дзіцем. У левай частцы — кветка. У руках дзіцяці—чырвоны шар, які сімвалізуе сонца. Жоўтыя пялёстні кветкі, валасы маці і дзіцяці, падзеленыя чорнымі лініямі, якія адпавядаюць контуру агульнага малюнка, шар, адзенне—усё гэта на светла-шэрым фоне стварае ўраўнаважаную каляровую гармонію. Кампазіцыя прачытваецца лёгка і хутка. Прыкладна ў такім жа плане выкананы «Вясна» і «Сонца». Гэтыя дэкаратыўныя пано з поспехам могуць быць выкарыстаны ў афармленні дзіцячых устаноў. Мастак да гэтай тэмы звяртаецца не ўпершыню. Мы памятаем яго кампазицыю «Дзеці» (фарфор, надглазурны росліс). Ярка, вобразна, з вялікай любоўю расказвае мастак пра дзяцей.

Цудоўная рыса ў творчасці мастака—адгукацца на ўсё новае, адлюстроўваць сённяшняе, зазіраць у будучыню. В. Леантовіч глядзіць на свет захопленымі вачыма. Сваю любоў да людзей, да прыроды перадае і сваім выхаванцам — юным мастакам у студыі мастацкай кераміки Мінскага Палаца пінераў. Колькі жывой назіральнасці, фантазіі ў іх творчасці—у роспісах на керамічнай плітцы, у керамічнай мініяцюры. Выстаўкі творчасці юных керамістаў Палаца пінераў цёпла сустрэты ў гарадах Савецкага Саюза і за рубяжом.

Валерый Леантовіч поўны новых творчых задум. Ён рыхтуецца да выстаўкі маладых мастакоў Беларусі і да выстаўкі, прысвечанай 50-годдзю Савецкай улады.

Я. ФРАНЦАЎ.

ЧАСОПІСЫ Ў ЖНІЎНІ

ПОЛЫМЯ БЕЛАРУСЬ МАЛАДОСЦЬ

Гэтая старонка нашай газеты пазнаёміць чытача са зместам жнівеньскіх кніжак часопісаў «Полымя», «Беларусь» і «Маладосць».

«ПОЛЫМЯ». Адкрываецца нумар вялікай нізкай новых вершаў Рыгора Барадуліна пад агульнай назвай «Вялікі мой — не Ціхі акіян». Тут жа змешчаны таксама «Паслясловуе да «Грознай пушчы» Аркадзя Куляшова, вершы Веры Вярбы, апавяданне Яўгена Васілёнка «Вячэрняя размова», пачатак аповесці Алеся Асіпенкі «Жыта». Пад рубрыкай «З літаратурнай спадчыны» друкуецца невядомае апавяданне беларускага савецкага пісьменніка Лукаша Калюгі «Цеснаватая куртачка».

У раздзеле «Новыя пераклады» змешчаны ўрыўкі з паэмы «Хадыка» Ул. Сыраномлі ў перакладзе Максіма Лужаніна і апавяданне польскага пісьменніка Юзафа Гена «Жонка героя» ў перакладзе П. Стафановіча.

Публіцыстыка часопіса прадстаўлена артыкуламі «Працоўныя рэсурсы» А. Ракава і «У змаганні за лепшую долю» (Да 60-годдзя газеты «Наша доля») М. Біча.

У раздзеле «Крытыка і літаратуразнаўства» друкуюцца артыкулы «Пра народную прыказку» М. Янкоўскага, «З крыніц народнага жыцця» Э. Сабалеўка, «Водгукі набзарскіх песень» Ул. Вінаградава, «У пошуках свайго свету» Леслава М. Бартэльскага, «Такім я ведаю яго» (Да 60-годдзя М. Паслядовіча) А. Матусевіча.

У жнівеньскай кніжцы часопіса рэцэнзуюцца кнігі: «Пры святле маланак» П. Панчанкі (рэцэнзент А. Яскевіч), «Расці, Ганька!» А. Васілевіч (Р. Шкраба), «Шматгалоссе жыцця» Ул. Юрэвіча (В. Каваленка), «Фольклорные традиции в доактябрьском творчестве Янки Купалы» А. Лянсу (М. Грынчык).

Ёсць у нумары раздзелы «Культура мовы», «Старонкі беларускай энцыклапедыі» і «Хроніка».

«БЕЛАРУСЬ». Восьмы нумар часопіса амаль цалкам прысвечаны Віцебскай вобласці. Адкрываецца ён артыкулам першага сакратара Віцебскага абкома КПБ А. Аксёнава «Край велічы і хараства». Аб пісьмах сялян Віцебшчыны Уладзіміру Ільічу Леніну расказвае ў сваім допісе Н. Лаготка. Нарысы, рэпартажы, замалёўкі, якія змешчаны ў нумары, расказваюць аб поспехах рабочых Віцебскага домабудаўнічага камбіната, Віцебскай шоўкаткацкай фабрыкі, Аршанскага льнокамбіната, пра сённяшнія справы былых заслонаўцаў і іх нашчадкаў — аршанскіх чыгуначнікаў, пра будаўніцтва Лукомльскай ДРЭС, пра слаўныя справы хлебаробаў калгаса імя Чапаева Глыбоцкага раёна, пра росквіт культуры ў гарадах і вёсках вобласці. У часопісе з расказамі аб жыцці Віцебшчыны выступаюць партыйныя і камсамольскія работнікі, кіраўнікі прадпрыемстваў і калгасаў, мясцовыя журналісты.

Літаратурная частка нумара прадстаўлена творамі пісьменнікаў — ураджэнцаў Віцебскай вобласці. Тут змешчаны вершы Петруся Броўкі, Анатоля Вялюгіна, Веры Вярбы, Еўдакіі Лось, Анатоля Вярцінскага, С. Панізніка, апавяданне Міколы Ваданосава. Надрукаваны таксама апавяданні маладых літаратараў з Віцебшчыны М. Боранава і Л. Главацкага.

У раздзеле «Новыя кнігі» змешчаны рэцэнзіі: Р. Бярозкіна на зборнік вершаў П. Панчанкі «Пры святле маланак»; І. Нісневіча на нарыс І. Гусіна пра жыццё і творчасць народнага артыста СССР Я. Цінокага і рэцэнзія М. Дзіміна на нарыс М. Андрушчанкі «Легенда аб мужнасці».

Шмат у часопісе пазнавальных матэрыялаў.

«МАЛАДОСЦЬ». У восьмай кніжцы «Маладосці» багата паэзіі. Тут змешчаны вершы Уладзіміра Верамейчыка, Алеся Наўроцкага, Яўгена Шабана, Марыі Шаўчонак і Паўла Прудніка. Проза прадстаўлена апавяданнямі Міколы Капыловіча, Алеся Масарэнкі і заканчэннем аповесці Лідзіі Арабей «На струнах буры».

У раздзеле «Дзень сённяшні — дзень заўтрашні» надрукаваны рэпартаж А. Шчарбакова «На Палессі гоман», нататкі журналіста Ул. Кузьмянкова з «Лаўсанбуда» і нарыс С. Кухарава «Доктар выбраў Лошніцу».

Пад рубрыкай «50 год Вялікага Кастрычніка» В. Марутка піша пра жыццё чырвонага камбрыга беларуса Б. Гарбачова, выкладчык БДУ імя Ул. І. Леніна М. Іоська расказвае пра нашага земляка, бясстрашнага бальшавіка-ленінца, былога наркома шляхоў зносін Туркестанскай рэспублікі Е. Дубіцкага.

Э. Дубінскі змяшчае ў нумары артыкул «Грознае рэха джунгляў» — пра мужнае змаганне в'етнамскага народа супраць амерыканскіх агрэсараў.

У раздзеле «Кнігі і час» змешчаны інтэрв'ю карэспандэнта часопіса з Іванам Новікавым, а таксама рэцэнзіі Ул. Караткевіча на зборнік вершаў В. Зуёнка «Красіва», А. Крывіцкага на «Беларускую антрапаніміку» М. Бірылі і рэцэнзія Ул. Юрэвіча на кнігу С. Пятровіча «Народныя тэатры Беларусі».

Ёсць у часопісе раздзелы «Сур'ёзнае і кур'ёзнае», «Старты і фінішы», «Шахматы», «Усмешкі маладосці».

Пятрусь БРОЎКА
(«Беларусь»)

РАЗМОВА З ДЗВІНОЮ

Ты, з дзён юнацтва па сягоння,
Прываражыла да сябе.
Дзвіна! Дзвіна!.. І слова
звоніць,
Як толькі ўспомніш пра цябе.

А хваляў колер сіні-сіні,
Адкуль іх вецер пазганяў...
Напэўна ў іх глядзеў Скарына,
Калі ў рад літары складаў.

І з тых часоў да нашых ранняў,
Праз даль стагоддзяў ідучы,
Калі пачуеш: «Палачанін!»,
Дык сэрцу радасна: гучыць!

Ён працаўнік і адмысловы.
Ты глянь з Сафійскае гары —
Згадай былыя пабудовы,
Сівыя ўгледзеўшы муры.

Стагоддзямі не ведаў зморы,
Ён клаў умелаю рукой...
Ды ўсё закрэсліў новы горад,
Што сёння ўзняўся над
Дзвіной.

Юнак каменны, што ў разгоне,
Усіх прывабіў да сябе.
Дзвіна! Дзвіна!... І слова
звоніць,
Як толькі ўспомніш пра цябе.

Ліпень, 1966 г.

Анатоль ВЯЛЮГІН
(«Беларусь»)

■ ■ ■

В. А. Ардыновіч

Здаецца, зноў жыццё пачата —
сляды і лодка на пяску,
і матчына старая хата
у галубіным гарадку.

Хто верны
родным запаветам —
здалёку вернецца сюды,
успомніўшы, як чорным цветам
цвілі над возерам сады.

Паротна нас лічыла куля,
а мы — гаротная радня —
за дротам бачылі, матуля,
цябе, як сонейка, штодня.

На волю ход,
тайнік за склепам,
і ты з кужэльным ручніком.

У змроку рукі пахлі хлебам,
маліннікам і малаком.

У нашай памяці навечна —
калючы лагерны паркан,
таемны ход і небяспечны
трывожны шлях да партызан.

Прысніцца плёс
пад хмарай чорнай
І голас твой: — У добры час...
Не толькі маці нарачонай —
ты роднай сталася для нас.

Як даўні боль,
як сон салдата —
сляды і лодка на пяску,
і матчына старая хата
у галубіным гарадку.

Рыгор БАРАДУЛІН
(«Полымя»)

БУЗКАШЫ

Ты не бачыў аніколі
Бузкашы?
Ты таджыку пра такое
Не кажы!

Не застольная бяседа
Бузкашы:
Захапі казла ў суседа
і — скачы.

Тут не бачаць ні начальства,
Ні радню,
Капыцяць і рвуць на часткі
Цішыню.
І чыны й пасады зніклі,
Зло — на злом!
Галава адно панікла
Над казлом.

Гэты козлік адпушчэння
Два пуды,
Не схаваеш у кішэні —
Паўбяды!

Жарабца хлапец асмуглы
Закасіў.
Сам бізун, як тыя цуглі,
Закусіў.

Горды дзед
белагаловы,
Як Памір,
Б'е галопам, б'е галопам
Жоўты жвір.

Зашчаміў казла нагою,
Вецер — друг.
Мчыць пагоня, не нагоніць —
Блізка круг.

Не відаць у тлуме, ў гуле
Ну ані —
На казле ляціць дзядуля?..
На кані?..

Кінуў чорнага і крэкча,
Перамок.
Мо апошні раз старэча
Перамог.

Раздзімаюць горны-храпы
Скакуны.
Тут не возьмеце нахрапам,
Крыкуны.

Мы ў даліне ўтульнай спеем,
Бы ў кашы.
Не да працы, не да спеваў —
Бузкашы!

Валам валяць людзі звыкла
З кішлакоў,
Заганяюць матацыклы,
Ішакоў.

Піялу з зялёным чаем
Асушы —
І прыпомніш ты з адчаем
Бузкашы.

У прэзідыумах млеюць —
Бузкашы,
На паважных асамблеях —
Бузкашы.
І на зборышчах паэтаў —
Бузкашы.

Ды таджыку ты пра гэта
Не кажы!..

«НЕМАН» № 8

«Мінск шматмоўны» — так называецца інтэрв'ю з замежнымі студэнтамі, якія навучаюцца ў нашых вну. Гэтым інтэрв'ю адкрываецца жнівеньская кніжка часопіса.

Паэзія прадстаўлена вершамі А. Вялевіча (пераклад Г. Пагірава), Х. Мальцінскага (пераклад з яўрэйскай мовы І. Шклярэўскага) і нізкай вершаў пачынаючых паэтаў.

Часопіс друкуе апавяданні В. Адамчыка «Салодкія яблыкі» і «Урок арыфметыкі» (пераклад Ул. Жыжэнкі), М. Герасімава «Цётка Аксіння», Л. Вакулоўскай «У мяцеліцу» і заканчэнне аповесці З. Сафіяна «Ключ следства» (пераклад з польскай мовы).

Да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка часопіс змяшчае нарыс П. Місько пра калгас «І Мая» Лёзненскага раёна.

Пад назвай «Прыгавораны да пажыццёвай катаргі» друкуюцца нататкі былога вязня Александраўскага цэнтрала І. Ф. Лысенкі. Падрабязнасці гераічнай смерці М. Дворнікава (у дадатак да апублікаваных у 5-м і 6-м нумарах «Немана») паведамляе Я. Драбінскі.

Уражаннямі ад сучаснай балгарскай архітэктуры дзеліцца на старонках часопіса А. Сурскі.

Пад рубрыкай «У свеце навукі» змешчаны артыкул Р. Баландзіна «Чалавек. Тэхніка. Розум».

Часопіс надрукаваў рэцэнзіі Р. Бярозкіна на кнігу Т. Табідзе «Вершы і паэмы» і Р. Саруханава на кнігу «Новыя гарады Беларусі».

У часопісе ёсць раздзелы «У нас на Беларусі» і «Знойдзена ў архівах».

Алесь НАЎРОЦКІ
(«Маладосць»)

ВЕРШЫ ПРА СЯБЕ

...вунь маленства маё,
вайной пахаванае,
дзе асколак сасне скрыжаваў
галіны рук.
Рукі галіны ўзняцца не маюць
сілы.

А час ідзе.
Яго не стрымаць хады.
І толькі высяцца кронамі
зялёнымі, мілымі,
за гадамі гады.

О, кронаў зялёных тых шалясценне!
Кронаў зялёных светлыя цені!

Каханне маўкліва...
Расстанне...
Журба...
І аб сустрэчы з Марынай —
адзінай —
ціхай ноччу мальба...
Мальба вуснаў, вачэй, рук...
Радасць мук...

Шчаслівая мне ўгатована доля:
дзеля каханай пралезу ў паэты,
як найхутчэй.

І вось першы верш нарадзіўся,
як дзіця, аддзяліўся з болем
ад вуснаў маіх, ад рук, ад вачэй...

...прыязджаю на пабыўку.
Родны дом...
Разбягаюцца сцежкі ў лясной
старане.

Сваім пачарнелым галлём
ахінае бяроза мяне.
Насустрач асенняй — сырой
і халоднай — рані,
як хочацца з табою, бяроза,
выйсці.

Бяроза мілая!
Вятры цябе балюча ранілі,
і ты сцякаеш крывёю лісцяў.
А каб кроў тую ніхто не ўбачыў,
цябе засцелюць сцягамі сінімі,
каб не ўстрывожыла нікога
плачам —
на шыю каралі начэпяць з інею.
Не гаруй!
Я побач!

...ох, як я пастарэў.
Медыцынай набіў аскому.
У жыццё ступаю смялей і смялей,
вершы пакрысе пішу
без дыплома,
з дыпломам лячу людзей.
Многа таго не знаходжу,
чаго шукаю.
Горкая дума часамі агорне:
навошта сэрца сваё пераціраю
між двух жорнаў?

...вунь яно і юнацтва маё,
дзе асколак сасне скрыжаваў
галіны рук.
Рук галіны вось-вось упадуць
долу.

А час ідзе.
Яго не стрымаць хады.
І толькі высяцца кронамі
без лісцяў, голымі,
за гадамі гады.
О, абскавыканых голляў
тых шастанне!
Сэрца ціхі зацьмелы стук!
Дзе ты, Марына, маё каханне,
ты — мальба маіх вуснаў, вачэй
і рук?
Я адзін-адзінокі іду па полі.
Голле голае б'е па маім плячу.
Невясёлая, горкая мне ўгатована
доля,
Толькі долі другой
не хачу.

Уладзімір ВЕРАМЕЙЧЫК
(«Маладосць»)

Я ІДУ

Я іду ў блакітнае ранне жыцця,
У дзяцінства сваё залатое:
Пахне пожняй гарэлай глухая
ралля,
Пахне поле крутым сырадоем.

Я іду у ружовае ранне жыцця,
У дзяцінства сваё залатое:
Пахне ступай дубовай у лыжцы
куцця
І буквар пахне фарбаю новай.

Я іду у шчаслівае ранне жыцця,
У дзяцінства сваё залатое:
Пахне сенам духмяным падушка
мая,
Пахне матчына хата спакоем.

Я іду у далёкае ранне жыцця,
У дзяцінства сваё залатое:
З Васілевіч ірвецца цягнік
у прасцяг...
А дзяцінства стаіць за спіною.

Яўген ШАБАН
(«Маладосць»)

РАЗВІТАННЕ З УСПЕНКАЙ*

Вось і ўсё.
Давай развітаемся
назаўсёды,
Успенская горка.
Мы сустрэцца яшчэ пастараемся,
ды на сэрцы чамусьці
торка...
Мо таму,
што з табою дружылі мы,
што сябрамі былі заўсёды,
мо таму,
што з табою дзялілі мы
усе радасці
і нягоды?..
Мо таму,
што калісьці марыў я
тут аб першым сваім каханні
і праседжваў на лаўцы
марна я
у чаканні яе
да рання?
А яна чамусь не прыходзіла...
А яна
ў другім месцы чакала,
неспакойна па вуліцы
ходзячы,
тыя ж словы,
што я,
шаптала.
Ты паслала ёй,
горка Успенская,
пазыўныя майго кахання,
з хваляваннем Дзвіны успененай
ёй паслала маё
хваляванне.
Прыляцела яна
птушкай быстраю.
Мне ў вочы
глядзела, маўчала
і ў руцэ сваёй
моцна сціснутай,
трапяткоё сэрца
трымала.
Вы даруйце нам,
пліты магільныя,
што мы шчасця свайго
не хавалі...
— Мы за шчасце ваша загінулі, —
нам з-пад пліт
галасы
адказалі.
...Дык давай жа,
горка Успенская,
мы прысядзем
на развітанне.
Дык бывай жа,
маё каханне!..
Час.
Бывайце!

* Так завуць Успенскую торку — адну з найпрыгажэйшых мясцін у Віцебску. У цэнтры зялёнага сквера — помнік-манумент героям Айчыннай вайны 1812 года. Трошкі далей на крутым беразе Дзвіны — рад магіл воінаў і партызанаў, якія загінулі ў часе Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гадоў.

Марыя ШАЎЧОНАК
(«Маладосць»)

ГУК АДЗІН, ДРУГІ...

Гук адзін, другі
сцякае быццам
Са смычка, які плыве па скрыпцы.
Кружыцца і, не знайшоўшы
выйсця,
Падае пад ногі жоўтым лісцем.

Гук адзін, другі...
за кожнай нотай
Цягнецца душа усёй істотай,
Нібы то сама яна, жывая,
З-пад смычка па кроплі выцякае.

Гук адзін, другі —
агеньчык сіні
Над струной асенняй павуціны.
Чалавечым роздумам глыбокім
Вее ад зямлі на кожным кроку.

Гук адзін, другі
расце, знікае,
Гэта восень, восень залатая
Думае і, не знайшоўшы выйсця,
Падае пад ногі жоўтым лісцем.

Малюнак мастака В. Долгава да апавядання М. Капылоўіча «У ружовым тумане». («Маладосць»).

Леанід ГЛАВАЦКІ
(«Беларусь»)

Спелыя КРУШЫНЫ

АПАВЯДАННЕ

Маці выцягнула з печы вялізны чыгун з прасянай кашай, узяла з паліцы ў мыцельніку рудую гліняную міску, напоўніла яе з коптурам і паставіла на парэпаны стол. Хлопцы ўжо не маглі ўрымсіць. Замільгалі лыжкі і аж захрумстала ў сківіцах. Маці лагодна ўсміхнулася: «Во ўмінаюць, аж за вушмі трашчыць», — толькі падумала, і раптам твар яе перасмыкнуўся, і яна пачала як бы прыслухоўвацца да нечага.

— Чым гэта пахне? — сумелася. — Потым узяла лыжку, паспытала з чыгуна, падумала хвілінку і стала варочаць з дна. І вось яна ўжо трымае ў руках нейкі аслізлы чорны акраец. Васька як трымаў, так і кінуў лыжку на стол і шмыгнуў да дзвярэй, за ім сігануў і Колька.

— Што гэта? — толькі і паспела перапытаць маці. У адказ бразнулі клямкай дзверы сянец.

— От баламуты, от недавяркі печаныя! — расхадзілася жанчына. — Пачакайце ж, я ж вас накармлю лазінай! Столькі проса зглумілі.

Але сыны не чуюць матчыных абяцанак. Зашыўшыся ў падстрэшку на пагрэбку, сядзяць сабе і ўпікаюць адзін аднаго:

— Ну і дурань ты, Колька, — пачынае старэйшы, Васька. — І трэба ж было табе ўперці губку ў кашу.

— Сам ты дурань. Хто ж знаў, што ў чыгуне будзе каша? Там вада стаяла. Трэ' было самому, калі такі разумнік.

— Што цяпер рабіцьмем? Губкі больш нідзе няма, я ўсе вішні аблазіў і пні абшнупарыў.

— Усё роўна мама не дасць зварыць. І за тое яшчэ ўкіне нам абодвум.

— Дык што ж, хай немчура забірае і жыта, і крушыны?

— Не-е-е, — цягне Колька. — Сенька Буслаў хваліўся, што ў яго труту процьма. На яйкі, шкмінда, выменьвае.

— На яйкі! — узрадаваўся Васька. — Дык чаго ж ты, смаркач зіркаты, маўчаў?

— Мы ж самі хацелі...

— Хацелі, хацелі. Я табе як камяхну зараз, дык і духі зойме. Давай скарэй на седала. Там нядаўна дзве кудахталі...

— ...А ўсё пачалося з тых самых спелых крушын. Хлопчыкі толькі што ўзбіліся на багатае месца. Ягад было столькі, што і лісця не відаць. Буйныя і сакавітыя, яны аж прыгналі галіны, кусты здаваліся суцэльнымі гронкамі. Іх саладкаваты прысмак казытаў у горле. Спорна напаўняўся кош. Хутка і дамоў. Але вось недзе трэснуў сучок пад нагамі, нешта шаснула побач, пачуліся крокі. Хтосьці, не спяшаючыся, прадзіраўся праз гушчэчу. Хлопцы суцішыліся, стаяць — і не дыхаюць. Проста на іх сунецца чалавек. Незнаёмы, зарослы густой рудаватай барадой, у даматканых суконных штанах і вялізных гамашах на босую нагу. Убачыў хлапчукоў, сумеўся на момант і рашуча ступіў насустрач.

— Ягадкі збіраем? — чалавек нахмурыў бровы. — Недавяркаў фашысцкіх, значыць, падлечваць? Ну-ну, давайце, іх там нашы лупяць як мае быць, а вы падлечвайце.

— Дык мы ж каб солі траха выручыць, — пачаў апраўдвацца Васька. — У мамкі зубы ківаюцца сталі. Цынга, кажуць.

— І многа солі даюць?

— Дзе там многа — слёзы, а не соль. За пяць хунтаў сушаных крушын адну шклянку.

— Небагата. І многія нясуць ім?

— Ды не. Старэйшыя, тыя лаюцца. А мы — самі, мамку шкада. Яна нічога не ведае, а то задала б нам лупцоўкі...

— Ну што ж, збірайце, лячыце мамку. У Заранках таксама збіралі, ды заўчора клець згарэла. Можа месяц падпёк — самая ж поўня... А немцы ў вёсцы ёсць?

— Няма, дзядзечка. Толькі «бобікі». Але ў сяло не ідзіце, бо схопяць і цягаць будуць. Гэтыя сабакары злосныя, як шэршні. Ім партызаны надоечы перцу падсыпалі, абоз адбілі.

— А вы адкуль ведаеце, хто я, што так засцерагаеце? — пацямнеў у твары незнаёмы.

— Мы, дзядзечка, адразу здагадаліся, што вы ад «бобікаў» хаваецеся. Не бойцеся, нікому не скажам. Мы ж не маленькія...

— Ну-ну, ягаднікі, — буркнуў чалавек ужо лагодней, — збірайце сваю крушыну, а то паасыпаецца.

І таропка рушыў у гушчар.

Кучаравая разгаліна засціць раскудлачаны вільчык страхі. Васька левай рукой абдымае шурпаты грушавы ствол, а правай ловіць у «прыцэл» рагаткі вялікі прагал між галін. Праз шкурацік ужо горача ў пальцы, перадаць бы яго ў левую руку, — але ж левай трэба трымацца за сук, каб не ўпасці. І хлапчук з усяе сілы нацягвае гуму правай, адтапырваючы то адзін, то другі палец. Шкурацік ужо смыліць, трываць больш няма сіл, і ён адпускае гумку. Чыркнуўшы аб лісце, абкручаны цэрай каменьчык апісвае крутую дугу і чмякае ў бульбоўнік, не даляцеўшы да гумна нейкіх дзесятак крокаў. З-пад гумна загыркаў сабака.

— Дай я, — злуе Колька, — а то ўвесь трут сапсуеш.

— Не замінай, назола, — спыняе яго Васька і спускаецца на сук ніжэй. — Ты толькі па вокнах цаляць майстар.

Цяпер усё пачынаецца спачатку. Хлапчукі злазяць па ствале ўніз да таго месца, дзе раскідзістыя галіны ўтвараюць нешта накшталт перавернутай трыногі. Ашчаперыўшыся за галіны рукамі і нагамі, Колька закрываецца світкай і пачынае красаць. У яго гэта лоўка выходзіць. Пасля некалькіх удараў кавалкам плоскага напільніка аб чорны крэмень маленькі шматок труту пачынае курэць. Васька, які ўжо трымаў напагатове круглы каменьчык, выхоплівае з рук брата цэру і хуценька загортвае ў анучку і абкручвае тоненькім дроцікам.

— Глядзі ж не прамаж, — як дарослы, настаўляе брата Колька, а сам аж дрыжыць ад нецярпення: так хочацца пульнуць і яму самому.

Васька займае ранейшае месца ў кроне дрэва. Цяпер ён стаіць на паўсагнутых нагах ужо амаль ва ўвесь рост і левай рукой трымаецца за ствол. Злашчасная разгаліна аказалася крыху ніжэй, чым была. Перакінуўшы ў прыгаршчах ужо добра закурэўшую анучку з каменьчыкам, ён хуценька ўціснуў яе ў шкурацік і, напяўшы гумку, пусціў амаль не цэлячыся. Абое замерлі. Выкінуўшы танюсенькую нітачку сіняга дымку, «зарад» мякка пляснуўся аб зеленаватую скарынку моху на страсе і, куляючыся, пакаціўся ўніз. «Няўжо нідзе не зачэпіцца?» — халадзеюць хлапечыя сэрцы. Праходзяць лічаныя секунды, і ў дзяцей быццам нешта абрываецца ў грудзях: «зарад» чмякае на ўзмежак.

— Мазіла! — скрозь слёзы шэпча Колька, выхопліваючы рагатку з братавых рук. — Сем яек Сенька садраў. А цяпер, сказаў, і за сто не дасць.

Васька вінавата маўчыць. А потым усё-такі агрызаецца:

— Ты ж сам такую «трасірку» прыдумаў. А цяпер на мяне звальваеш.

— Не ўмееш, дык і не бярыся. «Трасірка» не вінавата. Бачыў, як у Толіка пікіравала?

Так, у Толіка сапраўды ўсё выходзіла, як у мінамётчыка. Неяк на выгане яны, пастушкі, распалілі вогнішча, Вечарэла, кароў пара было гнаць з пашы дадому, але іх на змярканні, ужо калі пала раса, цяжка адарваць ад травы. Хлапчукі скакалі цераз агонь, кідалі ўверх галавешкі. Толік, па вулічнай мянушцы «Салапека» (гэтую мянушку ён атрымаў за звычку высалапляць язык, калі што-небудзь рабіў), выняў з кішэні рагатку, выграб з вогнішча вугольчык, паклаў яго цурачкамі ў шкурацік і запусціў угору. Яркая чырвоная нітачка ўспарола цямнеючае неба.

— Трасірка! — у захапленні закрычаў Толік.

Гэта назва спадабалася ўсім і прыжылася адразу ж. Хлапчукі павыцягвалі рагаткі. Але зрабіць «трасірку» не ўдавалася нікому. Адзін спаліў шкурацік, другі ледзь вочы сабе не высмаліў. Паступова ў дзяцей адпала ахвота да «трасірак». І толькі Толік, на зайздрасць хлапчукам, да цёмнай ночы паласаваў вячэрняе неба сваімі зыркімі «мінамі».

Думка скарыстаць «трасірку» ў сваёй «аперацыі» прыйшла ў галаву Кольку дні чатыры таму назад. Гэта было пасля сустрэчы ў крушынніку. Тады, прыдыбаўшы дамоў з добрым кошыкам крушын, хлапчукі высыпалі ягады на чарэнь печы і пабеглі сустракаць маці, якая павінна была вось-вось вярнуцца з поля. Сустрэліся з ёй на вуліцы. Маці была вельмі стомленай. Убачыўшы ля прыпечка перапэцканы кош, зірнула на печ, паківала моўчкі галавой, спаласнула рукі ў мыцельніку і пайшла даіць карову.

У тую ноч Кольку сніўся дзіўны сон. З вылінялага на сонцы неба сыпаліся на яго спелыя крушыны. Як чорны град, яны перш паяўляліся маленькімі кропкамі, увачавідкі раслі, закрываючы бліскучай чарнатой усё неба. Не даляцеўшы да твару мо на які локаць, ягадзіны раптам спыняліся, пакручваліся, і на іх сіняватай люстрыні праступаў сярдзіты твар незнаёмага. Потым яго надзьмутыя шчокі са свістам лопаліся, і халодны прытарны сок пырскаў у твар, заліваў нос, рот, вушы. Чорная дзяцярная рака падхоплівала Кольку, як пярынку, і несла ў крушыннік. Хлапчук, захліпаючыся, прачынаўся з немым крыкам. Ён пераварочваўся на другі бок, але варта было яму толькі самкнуць вочы, як той самы сон зноў паўтараўся.

Дні праз два ягады высахлі, і браты панеслі іх здаваць. Падвыпіўшы «бобік» — паліцай-прыёмшчык — узважыў на бязмене торбачку і адмераў плату — паўшклянкі волкай бурай солі. Дома хлапчукі паставілі соль на акно, пад сонца, і выйшлі на агарод. Селі ў заціш ку пад склепам, і тут Колька падзяліўся з братам тым, што не давала яму спакою ўжо не адзін дзень.

— Немчура з нашых крушын лякарства зробіць, а, Вась? — спытаў ён.

Васька здрыгануўся, бо не чакаў, што брат скажа тое, аб чым і ён думаў. Але спытаў:

— Ну і што?

— А тое... — Колька памаўчаў. — А што, каб гумно загарэлася ад месяца, як у Заранках?

Хлопчыкі пераглянуліся. Васька ўзіраўся ў меншага брата, быццам бачыў яго ўпершыню. У блакітных вачанятах, здавалася, затаіўся страх. Але вось Колька сцяў пухлыя, велікаватыя для яго твару губы — аж збегліся ў чародку вяснушкі на яго пераноссі, — паўсагнуў тонкія загарэлыя рукі — вось-вось, здаецца, кінецца на некага. У гэтай паставе ён быў падобны да маладога ястрабка-перапялятніка, што, выпаўшы без пары з гнязда, зашыўся ў траву і пыжыцца пры кожнай небяспецы. Васька, абняўшы брата за худзенькія плечыкі, ціха сказаў:

— Там жа вартавы стаіць, згледзіць...

— Стаіць, гад. Жыта сцеражэ. Поўнае гумно назвозілі. А мо «трасірку» пусціць?

— А ці выйдзе?

— У мяне ўсё выйдзе, — задзірыста сказаў Колька.

— А ты не выхваляйся, жаўтароты. Прыкусі язычок!..

Васька сказаў гэтыя крыўдныя словы без злосці, проста так, каб неяк ушчуваць брата, у якога і сапраўды ўсё выходзіла, за што б ні ўзяўся. Але Колька не пакрыўдзіўся. Ён так загарэўся сваім планам, што мо і не ўчуў абразы.

— Бачыш вунь той яблык, верхні на падсохлай галіне? — паказаў ён вачыма брату, перабіраючы ў кішэні каменьчыкі. — Лаві!

Васька не паспеў і рот раскрыць, як Колька пальнуў з рагаткі, і вялікі чырвоны яблык шпокнуў на парыжэлую траву.

— А ты кажаш — не выйдзе, — падскакваў Колька на адной назе...

Дні за два хлопчыкі да дробязей прадумалі свой план. Але падкрасціся блізка да гумна было нельга: там круглыя суткі тырчэў паліцай. Праўда, ён часта быў п'яны і спаў на ўзмежку, але затое ля дзвярэй прывязана была аўчарка. Здавалася, тая ваўкарэзіна чуе ўсё праз зямлю. Варта было нават воддаль прайсці каму, як адразу ж пачынаў вызвоньваць ланцуг, і надрыўны брэх напаўняў наваколле. Людзі стараліся абыходзіць клятае месца.

«Трасірка», значыць, таксама не падыходзіла. Гумно знаходзілася праз тры агароды. Няма чаго было і думаць, што лёгкі вугалёк даляціць да яго. Нават каменьчык не кожны раз дасягаў страхі.

Неяк адзін раз за аселіцай пачулася страляніна. Браты хутчэй ускараскаліся на грушу, каб паглядзець, што там такое. Па вёсцы перад тым хадзілі дзейкі, што партызаны не сёння-заўтра разаб'юць гарнізон. «Нарэшце дайшла чарга і да нас», — радаваліся хлапчукі. Але страляніна сціхла гэтак жа раптоўна, як і ўзнікла. Пасядзеўшы ў вершаліне грушы з якіх паўгадзіны, браты падаліся ўніз. Васька напяў рагатку і са злосці пусціў каменьчык. Прачарціўшы ў паветры нябачную дугу, каменьчык упіўся ў страху таго самага гумна. Хлапчукі не знаходзілі сабе месца ад радасці: значыць, «трасірку» можна запусціць са сваёй грушы. Вядома, крыху перароблену. Браты рашылі завязваць каменьчык у падпаленую анучку. Але першыя ж спробы расчаравалі іх. Па-першае, не так лёгка пакласці распаленыя вугалькі ў шкурацік рагаткі. Па-другое, калі іх нават загортвалі ў анучку, анучка згарала ад сустрэчнага ветру і рассыпалася ў пыл, не праляцеўшы і палавіны адлегласці да цэлі. Да таго ж, такі «зарад» цягнуў за сабой дымны след, і хто-небудзь збоку мог усё ўбачыць.

Тады адзін з братоў дадумаўся закруціць у анучку кавалачак цэры. Але дзе яе ўзяць, тую цэру на трут? Рашылі зрабіць самі. А гэта табе не проста — вырабіць з бярозавай губкі цэру. Спачатку губку трэба добра выварыць, а пасля біць, біць малатком, пакуль яна не стане мяккай, як нутро порхаўкі. Пасля таго як маці вылавіла іхнюю выварку з чыгуна з кашай, Васька з Колькай і зусім было абвялі. Выручыў іхні сябрук — Сенька Буслаў. У таго ўсё было ў прыпасах.

Раздабыўшы трут, хлапчукі адкладвалі «аперацыю» з дня на дзень. Боязна ўсё ж. Але вось старасты наказаў мужчынам збірацца ў падводчыкі — везці хлеб у горад. Як на тое, і паліцаі выехалі кудысьці з вёскі. «Момант», — сказаў Васька, і браты рашыліся...

... Васька не адабраў у Колькі рагатку. Той захінуўся світкай, красануў раз-другі, аддаў крэсіва брату і праз сцятыя зубы скамандаваў:

— Разгарні сваю анучку! Так, а цяпер давай дроцік.

Рукі Колькі хадзілі, як ходзікі. Васька слухаўся:

— Гатова. Трымай цяпер мяне за ногі, з усяе сілы трымай, — загадвае Колька, караскаючыся яшчэ на адзін сук вышэй. Ён выгнуўся як кошка, амаль не трымаючыся за ствол рукамі, нібы перавіваўся сваім гнуткім цельцам праз густыя галіны і сукі.

— За левую, кажу, за левую нагу мацней трымай, — шэптам просіць меншы брат, наводзячы рагатку.

Га-ах! — коратка фыркнуў шкурацік, і ў хлапчукоў заняло дух. Маленькая чорная кропачка точыцца ў неба ўсё вышэй і вышэй. Вось яна, здаецца, пералятае ўжо і гумно. І раптам — рэзка пачынае завальвацца ўніз і нырцае на страху, проста на кладзь.

Хлапчукі кулём скатваюцца з грушы на дол. Цяпер — пад застрэшак склепа. Там смялей за ўсё перачакаць марудлівыя хвіліны. Заплюшчыўшы для смеласці вочы, яны чакаюць, здаецца, цэлую вечнасць. Але вось па вуліцы пракаціўся гоман — перш у некалькі галасоў, пасля ўжо амаль нястройным хорам. Прарэзліва загаласіла жанчына, і трывожнае слова «пажар!» скаланула ўсё наваколле.

Малюнак мастака Г. Віткоўскага да апавядання М. Боранава «Скажу вечарам» («Беларусь»).

СПЯВАЕ БРАЗІЛІЯ

ГОСЦІ

З канцэрта артыстаў эстрады Бразіліі, якія цяпер выступаюць у Мінску, ідзеш з пачуццём шчырай удзячнасці.

Невялікі музычны ансамбль (у ім сем музыкантаў) і некалькі салістаў трымаюць увагу залы на працягу дзвюх гадзін, і ўсе гэтыя дзве гадзіны ад сэрца да сэрца льецца паэзія нацыянальнага мастацтва. Праграма канцэрта складаецца амаль цалкам з песень і танцавальных напеваў Бразіліі.

Пачынаецца канцэрт выкананнем бразільскага вальса «Першае каханне». У суправаджэнні ансамбля саліруе на флейце-пікала яго кіраўнік Альтаміра Карыльо—бліскучы віртуоз, выдатны музыкант. Сваё мастацтва ён паказвае і ў выкананні п'есы «Палёт птушкі». Гэты пачатак канцэрта адразу абнадзейвае слухачоў, і яны не расчароўваюцца.

Вельмі пранікнёна іграе на гітары Прэлюдыю вядомага бразільскага кампазітара Віла Лобаса саліст ансамбля Бруно Ферэйра (у ансамблі ён іграе на электрагітары, а таксама спявае ў вакальным ансамблі).

З музычных нумароў хочацца адзначыць і Арланда Сільвейра, які выканаў на акардэоне п'есу «Кавакіні» (назва бразільскага народнага інструмента).

Але асаблівы поспех спадарожнічае выступленню самага маладога ўдзельніка канцэрта—дзевятнаццацігадовага Закарыя. Ён іграе... на бутэльках. Вядучы тлумачыць, што хлопчык, які марыў пра музыку, рос у беднай сям'і рамесніка і не меў магчымасці іграць на музычных інструментах: вялікая колькасць пустых бутэлек у доме яго бацькі была таксама адной з прычын беднасці сям'і... І тады хлапчук вырашыў зрабіць музычны інструмент сам. Дзевятнаццаць бутэлек — рознай велічыні, з розным узроўнем рознакаляровай вадкасці ў іх—ствараюць той своеасаблівы інструмент, з якога, карыстаючыся драўлянымі палачкамі, Закарыя здабывае гукі, нечым падобныя на гукі металафона. Яго ігра сапраўды віртуозная.

Не раз на эстрадных канцэртах нас спрабавалі прывучыць да думкі, што эстрадным спевакам зусім не абавязкова мець «вакальны» голас (няхай даруюць мне такое спалучэнне слоў). Давяральны шэпт у мікрафон некаторыя схільны ўспрымаць як апошняе дасягненне эстраднага спявання. Аднак бразільскія спевакі «настойваюць» на адваротным: і ў эстрадзе вельмі добра слухаецца сапраўдны голас, прыгожы і сакавіты. Клеуза Пенафорт пацвярджае гэта сваім прыкладам. Спявачка выконвае негрыцянскія песні, і голас яе—моцнае грудное мецца-сапрана—проста зачароўвае слухача.

Прыгожым голасам валодае Жоржы Гоуларт—наш стары знаёмы: ён другі раз выступае ў Мінску і чацвёрты—у Савецкім Саюзе. Гоуларт—вялікі майстар. Песні пра каханне, пра Рыо-дэ-Жанейра, пра славуты бразільскі курорт Конакебана, пра ружу, пра рыбакоў, «Самба-фантастык» і «Карнавал Рыо-дэ-Жанейра»—узоры бразільскай нацыянальнай музыкі. Спявак да самазабыцця рынае ў гэты паэтычны свет, і зала чуйна адгукаецца на яго музычны «заклік»...

Нора Ней таксама знаёма мінскім аматарам эстраднай песні. Яна выконвае сучасныя бразільскія песні, спявае ў сучаснай манеры, заклікаючы на дапамогу свайму голасу тыпова эстрадныя прыёмы выканання: рухі цела, пластыку рук, прытанцоўванне.

А ўслед за ёй на сцэне з'яўляюцца ўдзельнікі вакальнага трыо Гуарані. Яны спяваюць песні лацінаамерыканскіх краін—парагвайскую, кубінскую, мексіканскую, венесуэльскую. І слухачы зноў настройваюцца на «народную хвалю»: вельмі ўжо сардэчна, задушэўна выконваюць спевакі народныя песні.

...Калі выступае Жоржы Гоуларт, ён «патрабуе» ад слухачоў не толькі ўвагі; ён вымагае саўдзелу ў канцэрце. І мы ахвотна апладзіруем у рытм песні, падпяваем яму. Нам робіцца блізкім мастацтва бразільскіх артыстаў.

Вялікая канцэртная паездка бразільскіх гасцей па нашай краіне працягнецца яшчэ доўга: па гарадах Прыбалтыкі, Малдавіі, Украіны, Закаўказскіх рэспублік; яны будуць выступаць у Маскве і Ленінградзе.

А. РАКАВА.

НАВІНЫ КІНО

ПРЫСВЯЧАЕЦЦА ДЗЯРЖЫНСКАМУ

«Подзвіг»—так называецца новая работа Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў, якая расказвае пра першыя паслярэвалюцыйныя гады, пра стварэнне Надзвычайнай камісіі па барацьбе з контррэвалюцыяй, пра яе арганізатара—Фелікса Эдмундавіча Дзяржынскага.

Вобраз Дзяржынскага, рэвалюцыянера і рамантыка, воіна і паэта, не раз прыцягваў увагу пісьменнікаў і кінематаграфістаў. Пра яго напісана нямала кніг для людзей самага рознага ўзросту, створаны мастацкія фільмы. Але дакументальнага фільма пра Дзяржынскага да гэтага часу не было, і тлумачыцца гэта перш за ўсё спецыфікаю дакументальнага кіно: занадта мала захоўвалася ў кінаархівах матэрыялаў аб дзейнасці ЧК, а самога Дзяржынскага амаль не здымалі. Таму стваральнікі фільма — рэжысёр Леанід Махнач і сцэнарысты Сямён Зенін і Аляксандр Навагрудскі—з самых першых дзён сутыкнуліся з цяжкасцямі. Пачаліся пошукі. Дзе толькі ні пабывалі кінематаграфісты!

І вось ззаду паўтара гады пошукаў і знаходак, радасцей і расчараванняў. Перад намі праходзяць кадры, якія ўзнаўляюць абстаноўку тых год, поўных нястач і гераізму. Узрушаюць сваёй сілай кадры голаду; зваленыя на зямлю кучаю целы — хутчэй шкілеты, а не целы, — жудасна худыя дзеці, якія грызуць кару дрэў. А побач, у кулацкіх свірнах, — тоны збожжа, але без бою яго не возьмеш. Чэкісты, якія адбіраюць лішкі збожжа ў кулакоў, падаюць пад кулямі з кулацкіх абрэзаў. Кучы зброі, адабранай у контррэвалюцыянераў. Твары кіраўнікоў контррэвалюцыі: Савінкаў, Спірыдонава, Пурышкевіч.

Надзвычай эмацыянальныя кадры, прысвечаныя барацьбе з беспрытульнасцю. Чэкісты садзяць нястрыжаных мурзатых дзяцей у грузавікі, вязуць у лазню. І як цудоўна пераўтвараюцца твары хлопчыкаў ад грэбеня і мыла.

Аўтары фільма знайшлі ўдалую форму раскрыцця вобраза «жалезнага Фелікса». Праз увесь фільм праходзяць роздум Дзяржынскага, урыўкі з яго дзённікаў і пісем. Усе падзеі нібы афарбаваны яго нетаропкім раздумлівым голасам.

Алена МІНКІНА (АДН).

СЕМ ДЗЁН У СОНЕЧНАЙ МАЛДАВІІ

З ДАРОЖНАГА ДЗЁННІКА

ПАНЯДЗЕЛАК

КІШЫНЁЎ СВЯТОЧНЫ

Кішынёву ўвосень гэтага года споўніцца 500 год, і горад рыхтуецца ўрачыста адзначыць гэтую знамянальную дату. Але сёння сталіца Малдавіі святочна ўпрыгожана з іншай нагоды. У гонар 50-годдзя Кастрычніка ў Малдавіі праводзяцца тыдні братніх рэспублік. Ужо былі Тыдзень Расіі і Тыдзень Украіны. І вось цяпер на кумачовых транспарантах, якія ўпрыгожваюць вуліцы Кішынёва, новае: «З 25 па 30 ліпеня — Тыдзень Беларускай ССР».

Шматлікія плакаты і афішы паведамляюць аб праграме свята. У кінатэатрах дэманструюцца беларускія карціны — «Масква—Генуя», «Пісьмы да жывых», «Веснавыя навальніцы», «Чужое імя». У бібліятэках арганізаваны выстаўкі кніг беларускіх пісьменнікаў, праводзяцца публічныя чытанні. Кніжныя магазіны выйшлі са сваімі столікамі проста на вуліцы і прапануюць пакупнікам вялікі выбар кніг з Беларусі.

Афішы паведамляюць аб выступленнях беларускіх вучоных, былых партызан, дзеячоў мастацтва. Малдаўскія пісьменнікі, артысты, лектары выступаюць у гэтыя дні з дакладамі і гутаркамі аб беларускай культуры.

Нават рэстараны прапануюць беларускія стравы.

АЎТОРАК

ФІЗІКАМ І ЛІРЫКАМ

Маладыя малдаўскія вучоныя, якія сабраліся ў адной з залаў Акадэміі навук, слухаюць выступленне беларускага вучонага доктара сельскагаспадарчых навук Тамары Нікандраўны Кулакоўскай. Яна расказвае пра сельскую гаспадарку і прамысловасць Беларусі, пра мінулае і сённяшні дзень рэспублікі. У Тамары Нікандраўны сапраўдны лектарскі талент. Вельмі ярка гаворыць яна пра беларускую навуку, пра яе людзей.

Пасля настае чарга лірыкаў. Аўтар гэтых радкоў расказаў прысутным пра беларускую музычную культуру, пра творчасць нашых кампазітараў.

Маладыя малдаўскія вучоныя з вялікай цікавасцю слухалі абодва — прызнаюся шчыра — даволі доўгія даклады. Ні Тамара Нікандраўна, ні я, шчыра кажучы, не планавалі такіх вялікіх выступленняў. Але аўдыторыя. Маладыя вучоныя гатовы былі слухаць яшчэ і яшчэ.

СЕРАДА

У ЖЫЦЦІ І НА ЭКРАНЕ

У цэнтральным лекторыі малдаўскай рэспубліканскай арганізацыі таварыства «Веды» — выступленне Героя Савецкага Саюза Марыі Барысаўны Осіпавай. Вядомая беларуская партызанка расказала, як было арганізавана пры яе ўдзеле забойства аднаго з самых крывавых і лютых гітлераўскіх катаў Вільгельма Кубэ. Расказ партызанкі дапоўніла кінакарціна «Гадзіннік спыніўся апоўначы».

А пасля сеанса пасыпаліся дзесяткі пытанняў: аб прататыпах дзеючых асоб, аб падрабязнасцях арганізацыі забойства, аб далейшым жыццёвым лёсе гераіні. Людзі пыталіся не толькі з цікаўнасці, усіх узрушыла жывая размова і хвалюючае кінаапавяданне.

ЧАЦВЕР

У КАМПАЗІТАРАЎ

Гістарычны лёс малдаўскай музыкі ў многім нагадвае лёс музыкі беларускай. У абодвух народаў не было да рэвалюцыі сваёй прафесіянальнай музыкі.

Тым больш выразныя і пераканаўчыя сённяшнія поспехі кампазітараў абедзвюх рэспублік.

На сустрэчы з малдаўскімі кампазітарамі, якая адбылася ў Саюзе кампазітараў Малдавіі, былі прадэманстраваны ў магнітафонным запісе Другая сімфонія Георгія Нягі, віяланчэльны канцэрт Валяр'яна Палякова, саната для альта і фартэпіяна Віктара Масюкова, фартэпіянныя п'есы і рамансы Васілія Загорскага паказалі, што ў Саюзе кампазітараў Малдавіі нямала яркіх і самабытных творчых індывідуальнасцей.

Малдаўскія кампазітары працуюць цяпер над новымі творамі, прысвечанымі 500-годдзю Кішынёва, 50-годдзю Кастрычніка, 100-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Аб'яўлен конкурс на лепшую песню аб Кішынёве, выдаецца зборнік твораў аб Леніне і г. д.

Саюзы кампазітараў Беларусі і Малдавіі абменьваюцца творчымі дэлегацыямі, пасылаюць адзін аднаму музычныя запісы. Але ўсяго гэтага недастаткова. Трэба куды больш шырока — у сімфанічных і камерных канцэртах, у лекцыях-канцэртах і г. д. — прапагандаваць творы малдаўскіх кампазітараў у нас і кампазітараў Беларусі — у Малдавіі. Пра гэта гаварылі ўдзельнікі сустрэчы.

ПЯТНІЦА

СВЯТА НА ВУЛІЦЫ МІНСКАЙ

Ёсць у Кішынёве новы жылы раён — Батаніка, а ў гэтым раёне — вуліца Мінская. Яна ўся забудавана новымі дамамі. Тут поўна зеляніны. Кожны двор — цяністы сад, пад кожным акном — клумба кветак.

На вуліцы Мінскай было арганізавана масавае свята, прысвечанае Беларусі. Свята пачалося дзіцячым ранішнікам. Юным гледачам паказалі кінакарціну «Дзяўчынка шукае бацьку». Пасля сеанса былі наладжаны дзіцячыя гульні і танцы.

Пакуль дзеці весяліліся, сабраліся дарослыя. Уся плошча перад сцэнай, пабудаванай у адным з двароў, была запоўнена гледачамі. На мітынгу выступілі госці з Беларусі і кішынёўцы — жыхары раёна. Вельмі цікавымі ўспамінамі аб бітвах на зямлі Беларусі падзяліўся старшы інжынер Міністэрства аўтамабільнага транспарту Малдавіі маёр запасу Міхаіл Дробатаў.

Пасля мітынгу — канцэрт мастацкай самадзейнасці, арганізаваны гарадскім маладзёжным клубам. Свята закончылася танцамі. Танцавалі ва ўсіх дварах і проста на вуліцы.

СУБОТА

ТЭЛЕБАЧАННЕ, РАДЫЁ, ГАЗЕТЫ

Сённяшні дзень запоўнены да рэшты. Раніцаю — аўтапрагулка па Малдавіі, па яе дагледжаных палях, паездка ў раённы цэнтр Дубасары. Гэты маляўнічы гарадок раскінуўся на крутым беразе Днястра — прыгажуні-ракі, якая для малдаванына тое, што Дунай для румына і венгра. Днестр — гэта гісторыя Малдавіі, яе паэзія. Сёння Днестр — вялікі працаўнік, які дае ваду палям, энергію заводам. Ля самых Дубасар раку перагарадзіла плаціна — і воды Днястра круцяць турбіны гідраэлектрастанцыі.

Лясістыя берагі вадасховішча вабяць у сваю прахалоду адпачываючых. Там поўна турысцкіх палатак, аўтамашын і матацыклаў. Як прыемна выкупацца ў спякотны дзень у халаднаватай і чыстай вадзе Днястра!

Днём — наведанне Малдаўскага радыё, расказ перад мікрафонам пра музычнае жыццё Беларусі. На працягу беларускага Тыдня малдаўскія радыё і тэлебачанне штодзённа перадавалі беларускія канцэрты. Выкарыстоўваліся кіна- і магнітафонныя плёнкі, прысланыя з Беларусі, — і гэтага аказалася дастаткова, каб даволі разнастайна паказаць беларускае мастацтва. Выступалі нашы праслаўленыя мастацкія калектывы, прафесіянальныя і самадзейныя, выступалі лепшыя салісты. Рэпертуар быў шырокі і разнастайны—ад эстрадных да оперных нумароў і балетных урыўкаў, ад масавай песні да сімфоніі і кантат.

Шырока адгукнуўся на Тыдзень Беларусі малдаўскі друк. Газеты «Советская Молдавия», «Вечерний Кишинев», «Молодежь Молдавии», штотыднёвік «Культура» і іншыя адводзілі ў кожным нумары па паласе матэрыялам, якія расказвалі пра жыццё беларускага народа. Вялікая ўвага аддавалася літаратуры і мастацтву. Былі апублікаваны апавяданні, нарысы, артыкулы І. Шамякіна, А. Савіцкага, А. Харкевіча, вершы П. Панчанкі, Р. Барадуліна, С. Грахоўскага, А. Бялевіча, А. Пысіна, малюнкі і гумарыстычныя мініяцюры з «Вожыка», рэпродукцыі з карцін і скульптур К. Касмачова, В. Савіцкага, Ул. Сухаверхава, А. Бембеля.

У суботні вечар—свята, прысвечанае Беларусі, у адным з новых мікрараёнаў Кішынёва—Рышканаве. Зноў прамовы, прывітанні, кветкі, канцэрт самадзейнасці, кіно, танцы. Але на гэтым дзень не закончыўся: запрашаюць у госці да аднаго з мясцовых актывістаў — арганізатараў свята. Ветлівыя гаспадары з гонарам паказваюць нядаўна куплены тэлевізар «Нёман». І калі тэлевізар уключылі — вось прыемнае супадзенне! — перадаваўся чарговы беларускі канцэрт, Акадэмічная харавая капела пад кіраўніцтвам Рыгора Раманавіча Шырмы выконвала песню Нестара Сакалоўскага «Нёман».

НЯДЗЕЛЯ

РАЗВІТАННЕ З СЯБРАМІ

Тыдзень Беларускай ССР у Малдавіі завяршыўся мітынгам і канцэртам у Зялёным тэатры парку культуры і адпачынку Кішынёва.

Юнакі і дзяўчаты ў нацыянальных касцюмах паднеслі беларускім гасцям хлеб-соль і... віно — такая малдаўская традыцыя.

Былі прамовы гаспадароў і гасцей. Вельмі тэмпераментна, з вялікім пачуццём выступаў вядомы малдаўскі паэт Емілян Букаў. Ён расказаў пра свае сустрэчы з Янкам Купалам, прачытаў вершы, прысвечаныя Беларусі і яе вялікаму песняру.

У першым аддзяленні канцэрта дружбы сімфанічны аркестр Малдаўскай дзяржаўнай філармоніі выканаў пад кіраўніцтвам маладога дырыжора Уладзіміра Малахава творы беларускіх і малдаўскіх кампазітараў: сімфанічную паэму Ул. Алоўнікава «Партызанская быль», «Палескую сюіту» Я. Глебава і «Малдаўскае капрычыо» Э. Лазарава. Другое аддзяленне было аддадзена аднаму з самых яркіх і цікавых малдаўскіх мастацкіх калектываў — аркестру народных інструментаў «Флуераш». Аснову яго рэпертуару складае самабытны і арыгінальны малдаўскі музычны і танцавальны фальклор. Усім спадабаліся салісты—народны артыст Малдавіі Георгій Ешану і зусім малады Нікалай Сулак, які толькі два гады назад прыйшоў у аркестр з сельскай самадзейнасці.

Доўга працягваўся канцэрт. Мелодыя беларускай «Лявонікі» зрадніла на ім з вогненнай «Малдаванескай».

Л. АЎЭРБАХ, спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

ПРАЗ СТО ГАДОЎ...

Вялікая падзея адбылася ў культурным жыцці лужыцкіх сорбаў — славянскай народнасці, якая жыве на тэрыторыі Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. У нямецка-сорбскім народным тэатры горада Баўцэн (акруга Котбус) у рамках фестывалю сорбскай культуры адбылася прэм'ера оперы А. К. Кокара «Якаў і Каця». У 1871 годзе закончыў Кокар гэты твор. Аднак палітыка імперыялістычных колаў Германіі, накіраваная на германізацыю сорбаў (што асабліва праявілася ў перыяд фашысцкай дыктатуры), прывяла да таго, што многія творы Кокара так і не ўбачылі свет.

І вось толькі амаль праз сто гадоў, калі лужыцкія сорбы атрымалі ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы шырокія магчымасці для развіцця сваёй нацыянальнай культуры, на поўную сілу загучала музыка самабытнага сорбскага кампазітара.

Опера-казка «Якаў і Каця» апавядае пра цярністы шлях двух маладых закаханых, якія ў фінале оперы знаходзяць сваё шчасце.

Пасля прэм'еры, якая, паводле паведамлення друку ГДР, была выключна цёпла прынята гледачамі, сакратар аб'яднання лужыцкіх сорбаў (Дамавіны) Ян Хандрык заявіў карэспандэнту АДН: «Заканчваючы фестываль сорбскай культуры, мы ўпершыню ў нашай гісторыі падводзім вынікі развіцця нацыянальнай сорбскай культуры ў ГДР. Фестываль паказвае не толькі прасякнутую клопатам нацыянальную палітыку ГДР, але і цесную сувязь духоўнага жыцця сорбаў з ГДР. Цяпер усе наглядна могуць пераканацца, у тым, што сорбская культура — гэта неад'емная частка сацыялістычнай нацыянальнай культуры, якая атрымлівае сваё далейшае развіццё ў ГДР».

І. МАСЛАЎ (ТАСС).

ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ

У мінулым годзе адбылася першая сустрэча чытачоў «Літаратуры і мастацтва» з творчасцю фотааматара Аляксандра Глінскага, выкладчыка Беларускага інстытута фізкультуры.

Сёння вы пазнаёміцеся з іншымі яго фотаработамі. Тэма іх тая ж — родная прырода, людзі, што акружаюць нас...

СЯМЕЙНЫЯ НЕЛАДЫ.



СУР'ЁЗНАЯ РАБОТА.

РАМОНКІ.

БЫВАЙ, ЛЕТА...

ЯШЫН З НАШАГА ДВАРА.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

9 жніўня

Першая праграма. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — для дзяцей. «Хлопчык з Неапаля». Мультыплікацыйны фільм. 17.20 — «У гарах маё сэрца». Кінанарыс. 17.40 — рашэнні XXIII з'езда КПСС — у жыццё. «Агні электраграда». Расказ пра горад энергетыкаў — Белаазёрск. Трансляцыя на Маскву. 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — для выпускнікоў школ. Расказы аб прафесіях. «Мы вас чакаем». 18.45 — «Свет сёння» (М). 19.15 — «Адзін дзень дэпутата Снарэнброда». Тэлевізійны спектакль. 20.35 — тэлевізійныя навіны (М). 21.05 — «Сельская навіна» (М). 21.45 — «След вядзе ў «Сёмае неба». Тэлевізійны мастацкі фільм ГДР. Першая серыя (М). 22.55 — «Саратаўскія сувеніры». Фільм-канцэрт.

Другая праграма. 17.00 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Шум-105». Тэлевізійны фільм (М). 17.40 — «Мой горад — мой лёс». Кінанарыс. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.15 — іграе лаўрэат Міжнароднага конкурсу А. Кісялёў (М). 18.45 — «Вечар успамінаў». Кінанарыс. 19.05 — рэклама, аб'явы. 19.15 — рускія вадэвілі. С. Расохін. «Нечаканы госць», П. Грыгор'еў «Дачка рускага акцёра». Перадача з Кіева. 20.35 — расказы пра балет. «Героі твораў М. Горкага ў балеце».

10 жніўня

Першая праграма. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — для дзяцей. Мультыплікацыйныя фільмы. (М). 17.30 — «Праўда пра рэлігію» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — рашэнні майскага Пленума ЦК КПСС — у жыццё. «Зямля абуджаецца». Пра меліярацыйныя работы ў Мінскай вобласці. 18.50 — музычны антракт. 19.00 — «Закаханы пінгвін». Мастацкі фільм. 20.30 — тэлевізійныя навіны (М). 21.00 — «На варце грамадскага парадку». Гутарка з работнікамі міліцыі. 21.30 — «След вядзе ў «Сёмае неба». Тэлевізійны мастацкі фільм ГДР. Другая серыя (М). 22.30 — «Адказваем на вашы пытанні». Выступленне намесніка старшыні выканкома Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных Р. А. Казачка. 22.50 — канцэрт па заяўках.

Другая праграма. 18.00 — старонкі вашых пісьмаў (М). 18.45— «Панарама Радзімы» (М). 19.10 — Д. Расіні. «Злодзей паняволі». Фільм-опера (М). 20.30 — «Як ён ілгаў яе мужу». Кароткаметражны фільм. 21.00 — «Навука — вытворчасці». Тэлевізійны часопіс (М).

11 жніўня

Першая праграма. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Дзецям пра звяранят». Перадача з Ленінграда. 17.30 — «Жыватворныя люстэркі». Перадача з Данецка. 18.00 — першынство СССР па футболу. «Крылы Савета» (Куйбышаў) — «Дынамо» (Кіеў). Перадача з Куйбышава. У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 19.45 — «Наша пошта». 20.00 — тэлевізійныя навіны (М). 20.30 — расказы пра разведчыкаў. «Героі аперацыі «Джэк». 21.15 — тэлевізійныя навіны. 21.35 — «Маладыя галасы». Музычная перадача. 21.10 — «След вядзе ў «Сёмае неба». Тэлевізійны мастацкі фільм ГДР. Трэцяя серыя (М). 23.00 — спявае Н. Херля. Перадача з Бухарэста.

Другая праграма. 19.15 — для дзяцей. «Крутыя ступені». Кінанарыс. 19.30 — «Пад чорным небам». Тэлевізійная кампазіцыя па аповесці Я. Отчанашака «Рамео, Джульета і цемра» і аднайменнай оперы К. Малчанава. 20.30 — Д. І. Фанвізін. «Брыгадзір». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Перадача з Ленінграда. 22.00 — музычны «Маяк» (М).

Гапоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС: г. Мінск, вул. Захарава 19.

Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР і рэдакцыя часопіса «Вясёлка» выказваюць глыбокае спачуванне пісьменніку Алесю Пальчэўскаму з прычыны напаткаўшага яго горя — смерці сястры Марыі Восіпаўны Лікадзіёўскай.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856. АТ 01005